© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 38 (2398)
16 мая 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

М. А. БАРЫСЕВІЧ — ПРЭЗІДЭНТ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

У Мінску 14 мая адбылася сесія агульнага сходу Акадэміі навук БССР. Яна абмеркавала арганізацыйнае пытанне.

Прэзідэнтам Акадэміі навук БССР выбран доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік Акадэміі навук БССР Мікалай Аляксандравіч Барысевіч.

Віцэ-прэзідэнтамі Акадэміі навук БССР выбраны акадэмікі АН БССР К. В. Гораў і М. Д. Несцяровіч.

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎЛЬЯНАЎСКУ

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА ГУЧЫЦЬ НАД ВОЛГАЙ

Горад на Волзе, прывольнай рускай рацэ. У свеце цяжка знайсці чалавека, які б не ведаў аб ім: у былым Сімбірску нарадзіўся, рос, вучыўся, рыхтаваў сябе да барацьбы за народнае шчасце найвялікшы чалавек усіх эпох і народаў, правадыр нашай партыі і стваральнік першай на планеце дзяржавы рабочых і сялян У. І. Ленін.

У нашага народа ўжо становіцца традыцыяй дэманстраваць перад землякамі У. І. Леніна свае дасягненні ў духоўным росце. Дні культуры ва Ульянаўску праводзілі пасланцы Літвы, Эстоніі, Арменіі, Татарыі, Башкірыі і Чувашыі.

І вось настала чарга беларусаў. Ніколі не пагасне ў беларускага народа сыноўская ўдзячнасць вялікаму Леніну за набытую свабоду, за сваю дзяржаўнасць. З вялікім душэўным хваляваннем рыхтаваўся ён да дзён культуры ва Ульянаўску — гэтай вялікай і поўнай глыбокага сэнсу творчай справаздачы на зямлі, дзе нарадзіўся любімы правадыр.

З раніцы 14 мая сотні гараджан накіраваліся да чыгуначнага вакзала. Ён расквечан дзяржаўнымі флагамі СССР, Расійскай Федэрацыі і БССР, транспарантамі. Тут рабочыя-аўтамабілебудаўнікі праслаўленага УАЗа, стваральнікі унікальных металаапрацоўчых станкоў, складаных электраапаратуры, навучэнцы і выкладчыкі, дзеячы мастацтва, літаратуры, культуры, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія работнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горада і вобласці.

Сустрэць гасцей прыйшлі першы сакратар абкома КПСС А. А. Скачылаў, намеснікі старшыні аблвыканкома Н. І. Кохаў і М. І. Астапаў, першы сакратар Ульянаўскага гаркома партыі А. І. Кудраўцаў, старшыня гарвыканкома Б. А. Лапцоў.

Пад гукі маршу поезд падыходзіць да перона вакзала. І адразу ж пасланцы Беларусі трапляюць у сяброўскія абдымкі, ім дораць кветкі, усмешкі, словы прывітання.

Ва Ульянаўск прыбыла дэлегацыя Беларускай ССР на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёвым. У яе саставе — першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Я. І. Скурко (Максім Танк), міністр культуры БССР М. А. Мінковіч, дырэктар Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, доктар філасофскіх навук К. П. Буслаў, намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ Я. Б. Парватаў, праслаўленая беларуская партызанка-падпольшчыца, Герой Савецкага Саюза М. Б. Осіпава, слесар-лякальшчык Мінскага трактарнага завода Герой Сацыялістычнай Працы Я. І. Клімчанка.

Да землякоў Ільіча прыехала вялікая група работнікаў мастацтва — дзяржаўныя народны хор і аркестр БССР, вядучыя салісты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, эстрадная група і салісты Белдзяржфілармоніі, а таксама беларускія кампазітары, пісьменнікі, кінематаграфісты, мастакі.

Народны паэт Беларусі Максім Танк, Герой Савецкага Саюза М. Б. Осіпава, Герой Сацыялістычнай Працы слесар-лякальшчык Мінскага трактарнага завода Я. І. Клімчанка вядуць пінэрэй 11-й школы Ульянаўска.

Ужо на Ульянаўскім вакзале ў народнай артысткі СССР Тамары Ніжнікавай аказалася многа сяброў.

Фота У. ЛУПЕЙКІ. (Прынята па фотатэлеграфе БЕЛТА).

Кожнага да глыбіні душы хвалюе думка: які ён — Ульянаўск, радзіма Леніна, як выглядаюць яго вуліцы і плошчы, на якіх некалі хадзіў юны Ульянаў, якая тут Волга-рака, прасторамі якой ён любаваўся.

На прывакзальнай плошчы перад позіркам узнікае гранітная фігура Валодзі Ульянава-гімназіста. Ён закрыў кнігу і, перажываючы прачытанае, задумліва ўглядаецца ў далячынь. Яго валявы твар светлы і натхнёны. Такім у 17 гадоў, у год заканчэння гімназіі, пакінуў ён родны Сімбірск.

Тут ля помніка ўзнік мітынг. Да гасцей з прывітальнай прамовай звярнуўся намеснік старшыні аблвыканкома М. І. Астапаў. Ад імя працоўных Ульянаўска і вобласці ён перадаў гасцям з Беларусі гарачае прывітанне, пажадаў ім вялікіх творчых поспехаў.

— Для нас, землякоў Ільіча, — сказаў ён, — Дні культуры Беларусі будуць вялікім і радасным святам дружбы народаў, і ўсе мы з нецярпеннем чакаем сустрэч з вамі.

Затым да мікрафона падышоў намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёў.

— Дарагія ўльянаўскія сябры, — сказаў ён, — перш за ўсё просім прыняць нашу сардэчную падзяку за цёплую і шчырую сустрэчу, за вялікую рускую гасціннасць, якую вы аказваеце нам, пасланцам Савецкай Беларусі. Вялікае вам дзякуй за гэту сардэчную сустрэчу.

З вялікім хваляваннем і радасцю мы ўступілі на блізкую і родную кожнаму савецкаму чалавеку волжскую зямлю, дзе нарадзіўся, вучыўся, рыхтаваўся да рэвалюцыйнай барацьбы У. І. Ленін — настаўнік працоўных усяго свету.

Імя Леніна бясконца дарагое савецкім людзям, усім рэвалюцыйным барацьбітам за свабоду і шчасце народаў, і, свята выконваючы ленінскія запаветы, Камуністычная партыя Савецкага Саюза ўпэўнена вядзе нашу Радзіму па шляху да камунізма.

Прадвызначэнне Дзён культуры Беларускай ССР, як і іншых брацкіх рэспублік ва Ульянаўску, з'яўляецца адной з важных падзей ва ўсенароднай падрыхтоўцы да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У гэтыя дні мы пастараемся найлепшым чынам азнаёміць працоўных вашай вобласці з велізарнымі дасягненнямі Савецкай Беларусі ў развіцці эканомікі, навукі і культуры, паказаць раданае і шчаслівае жыццё савецкіх людзей, расказаць аб тым, як на беларускай зямлі ажыццяўляюцца запаветы дарагога Ільіча.

— Нізкі паклон табе, радзіма бессмяротнага Леніна, — сказаў у заключэнне Р. Я. Кісялёў. — Зямны паклон табе, вялікі гераічны рускі народ.

Пад бурныя апладысменты Р. Я. Кісялёў ад імя ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР, ад усяго беларускага народа перадаў працоўным горада і вобласці сардэчнае прывітанне і добрыя пажаданні.

Мітынг закончан. Госці рассаджваюцца на машынах і накіроўваюцца ў горад.

■

14 мая ва Ульянаўскім абкоме КПСС адбылася сустрэча дэлегацыі Беларускай ССР з кіруючымі партыйнымі і савецкімі работнікамі вобласці. Першы сакратар абкома партыі А. А. Скачылаў расказаў гасцям аб развіцці эканомікі і культуры вобласці, аб перспектывах яе развіцця, аб тым, як працоўныя вобласці рыхтуюцца да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

■

Вечарам 15 мая ў памяшканні абласнога драматычнага тэатра адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзён культуры Беларусі. На чырвоных палотнішчах на рускай і беларускай мовах напісаны словы брацкага прывітання, якое землякі Ільіча звяртаюць да сваіх дарагіх беларускіх гасцей. У фае тэатра разгорнута вялікая фотавыстаўка, якая расказвае аб дасягненнях беларускага народа.

Глядзельная зала запоўнена да канца. Тут прадстаўнікі калектываў прадпрыемстваў, якімі абагаціўся за апошнія гады Ульянаўск, работнікі культуры і мастацтва вобласці, прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх, грамадскіх арганізацый.

Цёпла сустрэлі прысутныя з'яўленне ў прэзідыуме першага намесніка Старшыні Савета Міністраў РСФСР А. М. Школьнікава, дэлегацыі Беларускай ССР на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёвым. Разам з імі ў прэзідыуме першы сакратар Ульянаўскага абкома КПСС А. А. Скачылаў, старшыня выканкома абласнога Савета дэпутатаў працоўных В. П. Васільеў, іншыя кіруючыя работнікі горада і вобласці, прадстаўнікі працоўных.

Урачысты сход, прысвечаны пачатку Дзён культуры Беларусі, адкрыў намеснік старшыні выканкома абласнога Савета дэпутатаў працоўных М. І. Астапаў.

Слова атрымлівае старшыня Ульянаўскага аблвыканкома В. П. Васільеў. Ад імя абласнога і гарадскога камітэтаў партыі, выканкомаў абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных ён сардэчна вітае гасцей.

— Маючыя адбыцца Дні культуры, — гаворыць прамоўца, — з'явяцца красамоўнай справаздачай аб дасягненнях беларускага народа, з якім нас звязваюць даўнія вузы брацтва і дружбы.

Ад імя працоўных вобласці ён выказвае глыбокую ўдзячнасць Цэнтральнаму Камітэту КПБ, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета і Савету Міністраў БССР, усім творчым арганізацыям Беларусі за прадастаўленую магчымасць блізка пазнаёміцца з культурай і мастацтвам брацкага народа.

На трыбуне — рабочы Ульянаўскага прыборабудаўнічага завода Герой Сацыялістычнай Працы Б. Н. Епіфанаў. Ён перадаў гарачае прывітанне беларускім гасцям ад імя ўсіх ульянаўскіх рабочых.

— Мы будзем шчыра рады, — заявіў ён, — пазнаёміцца з вашым выдатным мастацтвам, будзем рады прымаць вас на заводах, фабрыках, у рабочых клубах. Няхай і ў далейшым мацнее брацкая дружба рускага і беларускага народаў.

Са словамі прывітання да пасланцоў Беларусі звярнулася дырэктар Ульянаўскага музычнага вучылішча Г. І. Шадрына. Яна расказала, што ўльянаўцы ўжо знаёмы з радам творчых калектываў і салістаў, якія прыязджалі з Беларусі.

Са словам у адказ выступіў кіраўнік дэлегацыі Беларускай ССР, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёў.

Ад імя Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў рэспублікі, ад імя ўсяго беларускага народа ён перадаў працоўным Ульянаўска і вобласці гарачае прывітанне і пажаданні поспехаў у падрыхтоўцы да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Мы прыехалі на радзіму Леніна, сказаў Р. Я. Кісялёў, каб расказаць вам, з якім высокім патрыятычным натхненнем і працоўным уздымам рыхтуецца беларускі народ сустрэць стагоддзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

У выніку гераічных намаганняў працоўных рэспублікі, накіроўваемых і кіруемых Камуністычнай партыяй, указаў прамоўца, стала магчымым пасля вайны не толькі ўзняць рэспубліку з руін і попелу, але і далёка неяўзыйсці даваенны ўзровень развіцця народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Мы рады адзначыць, сказаў ён, што жывым увасабленнем вялікай дружбы народаў з'яўляецца традыцыя брацкай сардэчнасці ў адносінах паміж беларускім народам і працоўнымі Ульянаўскай вобласці. У снежні 1941 годзе тысячы жанчын і дзяцей з Беларусі былі прынятыя сем'ямі ўльянаўцаў, як прымаюць родных і блізкіх, — з усёй шырынёй і шчодрасцю рускай душы. Калі войскі Савецкай Арміі вызвалялі ад акупантаў беларускі горад Мазыр, працоўныя Ульянаўска накіравалі мазыранам эшалон розных тавараў, каб падтрымаць у цяжкія дні разораны гітлераўцамі горад. Калі мы пачалі адраджэнне спапялёнага вайной Мінска, Ульянаўская вобласць адной з першых накіравала ў адрас беларускай сталіцы эшалон з прамысловым абсталяваннем і будаўнічымі матэрыяламі.

Мы з радасцю адзначаем, што народнагаспадарчыя сувязі паміж БССР і Ульянаўскай вобласцю ў цяперашні час атрымалі шырокі размах. Дзесяткі і сотні назваў прамысловай прадукцыі паступаюць у Беларусь з Ульянаўскай вобласці. Аўтамабілі, станкі, электраматоры і іншыя вырабы з ульянаўскай маркай высока цэняцца ў нас у рэспубліцы. З Беларусі да вас паступаюць нашы трактары, аўтасамазвалы, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, шарсцяныя тканіны, гадзіннікі і многае іншае. Ідзе абмен у галіне літаратуры і мастацтва.

Пад бурныя апладысменты Р. Я. Кісялёў заключае:

— Няхай жыве ў вяках імя геніяльнага прадаўжальніка рэвалюцыйнага вучэння Маркса і Энгельса, заснавальніка Камуністычнай партыі, кіраўніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян — Уладзіміра Ільіча Леніна.

Затым адбыўся вялікі канцэрт майстроў беларускага мастацтва.

М. БУТРЫМОВІЧ, Б. БАБЛЮК, спецкары БЕЛТА.

ФЕСТЫВАЛЬ АДКРЫТЫ!

Кінатэатр «Партызан», 14-га мая, восем гадзін вечара... На вялікую сцэну падымаюцца прадстаўнікі дэлегацый кінематаграфістаў Беларусі, Літвы, Малдавіі, Латвіі, Эстоніі.

Старшыня Камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак адкрывае Дзесяты занальны агляд-конкурс работ кінематаграфістаў Беларусі, Літвы, Малдавіі, Латвіі, Эстоніі. Ён гаворыць аб добрай традыцыі правядзення такіх форумаў і плёне, які прыносяць яны развіццю нацыянальнага кінамастацтва, аб той шчырай братняй зацікаўленасці, з якой беларускія кінематаграфісты сочаць за дасягненнямі сваіх калег. Прамоўца падкрэслівае, што перад усімі савецкімі кінематаграфістамі стаяць агульныя задачы.

Ад імя Саюза кінематаграфістаў СССР удзельнікаў агляду-конкурсу павіншаваў вядомы рэжысёр народны артыст СССР Р. Рашаль.

Мінае яшчэ хвіліна і ўспыхвае фестывальны экран... За паўгадзіны да таго наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў прадстаўнікоў братніх дэлегацый.

Учора на аглядзе-конкурсе быў Дзень Латвійскай ССР. Былі паказаны наступныя конкурсныя фільмы: мастацкія — «Армія сітаўкі зноў у баі», «За паваротам паварот»; навукова-папулярныя — «Гвінейскія сустрэчы», «Дарагая рэдакцыя», «Чацвёрты старшыня», «Андрэй Упіт», «Новы воблік сяла»; хранікальна-дакументальныя — «Савецкая Латвія» № 5, «Савецкая Латвія» № 17; тэлевізійныя — «Вясновы слалам», «Партыта ў стылі барока», «Паглядзіце, маладыя».

Барыс КУНЯЕЎС, галоўны рэдактар Камітэта па кінематаграфіі Савета Міністраў Латвійскай ССР:

Вось ужо дзесяць разоў збіраемся мы, каб абмяняцца думкамі, прыгледзецца да таго, што робяць нашы налегі ў братніх рэспубліках, паназапаць, чым багаты самі. Зразумела, такія сустрэчы прыносяць вялікую карысць.

Характэрная рыса гэтага фестывалю — у ім удзельнічаюць таксама і тэлевізійныя фільмы. Добра гэта ці дрэнна? Напэўна, і тое і другое адразу. Добра, бо дазваляе пазнаёміцца яшчэ з адной галіной пошукаў сучаснай кінамовы, а дрэнна — бо празмерная загружанасць праграмы, дальбог, не пакідае часу на тое, каб абмяняцца думкамі, паспрачацца.

Латвійская кінематаграфія больш за ўсё была вядома сваімі хранікальна-дакументальнымі і навукова-папулярнымі карцінамі, а мастацкае кіно адставала. У гэтым годзе, на мой погляд, ёсць тэндэнцыя да згладжвання гэтага разрыву. Мы прывезлі два мастацкія фільмы, адзін з якіх, відаць, можа быць цікавы для ўсіх. Я маю на ўвазе фільм «За паваротам паварот», над якім працавалі рэжысёр Альгерд Дункерс, сцэнарыст Андрэй Дрыпе і аператар Мік Звірбуліс.

Рымтаўас ШЫЛІНІС, рэжысёр, Літоўская ССР:

Я — дакументаліст. Таму, прабачце, буду больш гаварыць пра тыя пытанні, што стаяць сёння перад нашым навукова-папулярным і дакументальна-хранікальным кіно. Па-першае, упэўнены, што дакументальнае кіно можа вырашыць амаль усе тыя праблемы, якія стаяць перад сабой і мастацкае. Мне здаецца, што ў самай блізкай будучыні з'явіцца вельмі цікавыя стужкі якраз на скрыжаванні гэтых двух кінажанраў. Бо і мастацкае кіно пачынае даволі пільна прыглядацца да тых творчых знаходак, якія далі магчымасць кінадакументалістам зрабіць такі яскравы рывок наперад. Прынамсі, у нашым літоўскім кінамастацтве.

Гэты фестываль-агляд цікавы якраз таму, што на ім прадстаўлены амаль усе кінематаграфічныя жанры — ад лялечных і малаваных фільмаў да кіначасопісаў, ад мастацкіх кінаэпапей да тэлевізійных навел. Я супраць жанравай настаўасці.

Мае землякі пакажуць у Мінску мастацкую стужку «Калі я быў маленькім», сцэнарый якога напісалі Е. Мерас і рэжысёр А. Арамінас. Вядомы і на Беларусі В. Жалакявічус — аўтар другой мастацкай стужкі — «Пачуцці» (рэжысура А. Дауса і А. Грынявічуса). Работнікі Літоўскага тэлебачання прывезлі пяць стужак.

А вучыцца мы, удзельнікі мінскай сустрэчы, будзем адзін у аднаго абавязкова, бо і па ўзросце склад дэлегацый вельмі малады — пераважна аўтары аднаго-двух твораў, чыдаючыя літаратары, анцёры, студэнты. Ну, і паспрачацца — такі народ любіць і умее.

Кальё КІЙСК, кінарэжысёр, Эстонская ССР:

Калі разам збіраюцца кінематаграфісты з розных рэспублік, ім ёсць пра што пагаварыць. І калі кінафестываль прадугледжвае шырокую творчую дыскусію, я за такі фестываль. Калі ж пачынаецца гонка за прызамі, за месцамі, то траціцца высакародная мэта фестывалю. Мы, эстонцы, спадзяёмся, што ў Мінску будзе панаваць настрой добразычлівай налегіяльнасці, шчырага абмену вопытам, думкамі, хоць сёлета наша сустрэча і называецца аглядам-конкурсам.

Мы прывезлі на фестываль два мастацкія фільмы, шэсць навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных і шэсць тэлевізійных. Наўрад ці трэба гаварыць пра іх — глядач сам убачыць іх на экране, а журы зробіць прысуд. Але, не баючыся, што мае словы могуць уздзейнічаць на думку журы, скажу, — многае з таго, што эстонскія кінематаграфісты сёлета паназваюць на фестывалі, здаецца нам вельмі цікавым.

Мабыць, і імёны такіх рэжысёраў, як С. Нымін, Х. Парс і Ю. Моюр, прыцягнуць увагу аматараў кіно, бо творчасці гэтых мастаноў уласцівы пошук новага ў кінамастацтве.

Ад Балавежскай пушчы не так ужо і далёка да хваль Балтыйскага мора. Мы заўсёды адчуваем сябе суседзямі Беларусі. І нам будзе вельмі цікава не толькі пазнаёміцца з вашым кінамастацтвам, а і выслухаць вашу думку, вашы ўражанні ад таго, што пакажа Эстонія на майскім экране Мінска.

Эміль ЛАЦЯНУ, рэжысёр і сцэнарыст, Малдаўская ССР:

У Мінску з'ехаліся прадстаўнікі, умоўна кажучы, «малых» студый — не ў сэнсе іх творчых патэнцыялаў, а па колькасці выпускаемых карцін. Перад усімі намі стаяць адны задачы і праблемы творчага і вытворчага характару.

Мабыць, галоўная з іх — набыццё свайго, сучаснага і нацыянальна выразнага аблічча. Мы павінны здымаць фільмы, якія неслі б паўныя рысы нацыянальнай духоўнай культуры. Гаворка ідзе не пра знешнія атрыбуты, а пра самую сутнасць кінатвораў аб жыцці і барацьбе народа.

Наша студыя маладая: і ў прамым і фігуральным сэнсе. Большасць малдаўскіх рэжысёраў, сцэнарыстаў і аператараў толькі набліжаецца да 40-гадовага ўзросту. Можа, дзякуючы гэтаму, на нашай студыі склалася атмасфера творчага спаборніцтва — непадобныя адзін на аднаго рэжысёры (і па творчым тэмпераменце, і па густах) і фільмы яны робяць адметныя па почырках і стылявых асаблівасцях.

Большасць з нас прыйшло ў кіно з літаратуры. Зразумела, гэта адбіваецца і на той кінамове, якая стала нашай зброяй, — на экран прыйшла паэтычнасць і лірычны роздум. Умацоўваюцца і прафесіянальныя якасці кінематаграфістаў з літаратарамі. Наша студыя імкнецца да таго, каб кожная новая работа калектыву маладых аўтараў была яшчэ і школай вывучэння жыцця, яго асэнсавання новым для іх відам мастацтва.

На аглядзе-конкурсе ў Мінску мы пакажам мастацкую балету аб юнацкіх гадах Аляксандра Грына («Рыцар мары» У. Дзербянёва) і знятае мной па маім сцэнарыі «Гэтае імгненне» пра геаізм патрыётаў-інтэрнацыяналістаў у барацьбе з фашызмам.

Сёння — Дзень Літоўскай ССР, 17 мая — Эстонскай ССР, 18 мая — Малдаўскай ССР, 19 мая — Дзень Беларускай ССР.

Перад адкрыццём Дзесятага традыцыйнага агляду-конкурсу яго ўдзельнікі прыйшлі да помніка У. І. Леніну. Чырвоныя кветкі ляглі ля чорнага граніту пастамента...

Потым яны адправіліся да абеліска Перамогі, каб ускласці вянок і аддаць даніну пашаны тым, хто ўратаваў нашу краіну ад фашысцкай навалы.

На здымку — першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР народны артыст БССР У. Корш-Саблін (злева) і народны артыст СССР Р. Рашаль ускладаюць вянок да абеліска Перамогі.

Фота Ул. КРУКА.

УСЁ АДЧУВАЕШ СЭРЦАМ

З першых жа крокаў на гасцінай ульянаўскай зямлі, зямлі, дзе нарадзіўся Ленін, на нас абрынулася столькі ўражанняў, што ўвабраць іх адразу проста немагчыма.

Толькі што, здаецца, наш поезд падышоў да перона Ульянаўскага вакзала, толькі што адгучалі прамовы на мітынгу, што ўзнік тут жа, на прывакзальнай плошчы, а чырвоныя аўтобусы ўжо імчаць беларускіх гасцей па Ульянаўску, па памятных ленінскіх мясцінах.

Можа ўпершыню ў жыцці я зразумела, як не патрэбен мне экскурсавод, як яго словы перашкаджаюць засяродзіцца, убачыць тое, што хвалюе кожнага з нас асабіста...

Дзіўнае пачуццё ахоплівае цябе, калі ўваходзіш у сад, што абкружае Дом-музей Леніна. І хоць здаецца, што ты ўжо сто разоў чытаў і чуў пра гэты дом, вядомы ўсяму свету, ведаеш па апісаннях да дробязей, — усё ж хвалюешся, вельмі хвалюешся, бо разумееш — тое, прачытанае, пачутае — зусім іншае. А зараз ты ўсё ўбачыш на ўласныя вочы.

Каб трапіць у Дом-музей, трэба пачакаць — экскурсій вельмі і вельмі многа. З усіх куткоў краіны, з самых далёкіх куткоў планеты. Гучыць мова многіх краін свету — французская, англійская, нямецкая, іспанская. Але ў патоку іншаземных слоў чуеш вельмі блізкае: «Ульянаў», «Ленін», «Валодзя»...

Мы ходзім па невялікіх, вельмі сціпла абстаўленых пакоях. Гасцінная — тут вечарамі збіралася ўся сям'я Ульянавых. Марыя Аляксандраўна садзілася за фартэпіяна і ўсе разам спявалі, слухалі музыку. Іншы раз сюды прыходзілі таварышы Ільі Мікалаевіча, і да позна ішлі размовы аб справах. Яго паважалі, любілі. Ён быў пераканаўным дэмакратам, выдатным педагогам.

Вузенькая драўляная лесвіца, якая нагадвае карабельны трап, вядзе наверх, у пакоі дзяцей. Як і ва ўсёй кватэры, тут толькі самае неабходнае: сталы, крэслы, ложкі і, вядома, кнігі — Някрасаў, Леў Талстой, падручнікі, часопісы, палітычная літаратура.

У пакоі Валодзі нават экскурсавод перастаў гаварыць. А можа мне толькі так здалося? Мы доўга стаім, узрушаныя сустрэчай з дзяцінствам Ільіча.

Спачатку здаецца, што Ульянаўск падобны на многія іншыя гарады. У аўтобусах, як і ўсюды, шамацяць «балонні», вельмі знаёмыя абрысы многіх будынкаў. Але праходзіць пэўны час, і пачынаеш разумець, што Ульянаўск — асаблівы горад, што тут амаль кожная мясцінка жыве памяццю пра вялікага сына гэтай зямлі.

Ульянаўцы — вялікія патрыёты свайго горада. І дарослыя, і малыя. Да каго б ні звярнуўся, табе тут жа з гонарам пачнуць расказваць аб выдатнасцях Ульянаўска, аб яго памятных мясцінах, звязаных з імем Ільіча.

Дарэчы, самыя першыя інтэрв'ю ў гэтым горадзе далі мне дзве дзяўчынкі — Наташа і Каценька, якія я сустрэла ў калідоры школы, дзе некалі вучыўся Валодзя Ульянаў. Сёння тут вучацца гэтыя дзяўчынкі. Яны бяруць мяне за рукі і цягнуць на другі паверх у класны пакой Валодзі, паглядзець на парту, за якой ён сядзеў. Тварыў дзяўчынак па-даросламу сур'ёзныя. Перабіваючы адна адну, яны расказваюць і расказваюць пра тое, як вучыўся гімназіст Валодзя Ульянаў...

Мы доўга яшчэ ездзім па горадзе, дзе «кожны камень Леніна помніць», дзе б'ецца аб бераг бясконцая волжская хваля, як і ў тыя далёкія часы, калі сюды прыходзіў Валодзя Ульянаў.

Стамілася, наша дзяўчына-экскурсавод. Няхай адпачывае. У горадзе Леніна не патрэбны праважатыя, тут усё адчуваеш сэрцам.

І. ПІСЬМЕННАЯ, спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ДЫСКУСІІ
На парадку дня:
ПРАБЛЕМЫ АПАВЯДАННЯ

Алесь ЯСКЕВІЧ

ПАХВАЛА ЖАНРУ

Неяк увесь час уяўлялася, што наша апавяданне, такое сур'ёзна-сталае, з яго цікавасцю да самых драбнюткіх і мілых праяў жыцця, заслугоўвае добрага і разумнага даверу. Гэты разважлівы, сціпла пранаўлюбівы жанр, што не асабліва гнаўся за гучнай славай, ва ўсе навят не ў надта спрыяльныя пасляваенныя літаратурныя гады, звычайна аказваўся бліжэй да чалавека, да яго розуму і спадзяванняў.

Ды і ўвесь гэты час, што мінуў пасля вайны, у нашай прозе неяк вельмі шчасціла на таленты апавядальнікаў: імёны Янкі Брыля, Аляксея Кулакоўскага, Івана Мележа, Міколы Лупсякова, Янкі Скрыгана, Івана Навуменкі, Алены Васілевіч, Алеся Пальчэўскага гаворацъ самі за сябе.

Асаблівае ажыўленне ў апавядальны жанр унесла маладое пакаленне празаікаў у сярэдзіне 50-х гадоў. В. Адамчык, І. Пташнікаў, М. Стральцоў, Б. Сачанка, І. Чыгрынаў, У. Дамашэвіч, а пазней А. Кудравец, В. Карамазаў, М. Капыловіч, М. Вышынскі — якая маладая пераклічка галасоў, якая добрая творчая цеснатa і спаборніцтва ўсталёўваюцца ў нашай навелістыцы з прыходам гэтых аўтараў!

Прывязанасць да апавядальных форм, верная служба і па сённяшні дзень малому жанру пераважнай большасці маладых пісьменнікаў мне здаецца не выпадковай. Пры ўсіх іншых акалічнасцях, гэта інтуітыўная пяга да апавядальнай формы ў значнай ступені дапамагала пісьменнікам бліжэй трымацца жыцця.

Мы ўсё яшчэ мала ведаем свой літаратурны працэс, слаба адчуваем рух, «дыслакацыю» жанравых сіл на перадавых пазіцыях жыцця.

Калі прыходзіць пара падрахунку літаратурных дасягненняў, іх, натуральна, дэманструе раман салідным фаліянтамі паважна-тоўстых тамоў. Але, ніяк не змяншаючы ролі ў сучаснай літаратуры вялікіх форм, усё ж не трэба забываць, што часта, вельмі часта на бурлівым перавале часу, калі заўтрашні дзень даносіў нейкія новыя жыццёвыя павевы, у разведку выпраўляліся і напачатку аказваліся найбольш прыдатнымі іменна малыя даследчыя формы. І калі б узяцца скласці кнігу, як некалі захапляўся гэтай ідэяй В. Бялінскі, з лепшых, найбольш «уважлівых» да рэчаіснасці сучасных апавяданняў, я перакананы, што ў гэтай, няхай сабе і раздробленай на кроплі мазаіцы, жыццё адгукнулася б вельмі моцна. Ахоплены былі б, магчыма, не ўсе сферы, але пра жыццё простага чалавека ў ваш складаны час сказана было б сур'ёзна і глыбока.

Трапам у артыкуле В. Бурана «Вялікія праблемы малога жанру» — сур'ёзная трывога аб адставанні апавядання: і здрабнеў быццам яго герой, і яркіх характараў няма, і драбнатэм'е, і адсутнасць філасофскай шырыні, і размытая форма. І наогул жанр як бы не туды бярэ кірунак.

В. Буран называе добры дзесятак «сімптомаў», якія, нібыта, сведчаць аб сур'ёзным здрабненні жанру. І ўсё ж не хацелася б ісці за катэгарычнай і нейкай стандартызаванай логікай крытыка пры аналізе сённяшняга стану апавядання.

В. Буран не заўважае, што нейкія новыя звенні прыйшлі ў рух, новыя таленты ўзыхо-

[Заканчэнне на 3-й стар.]

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

УСЯГО ТОЛЬКІ ВІТРЫНЫ

● КІЛАМЕТРЫ ВЫСТАВАЧНАЙ ПЛОШЧЫ ● КАЛІ ДОБРАЯ ЗАДУМА ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў ШТАМП ● «БЕЛГАНДАЛЬРЭКЛАМА» — ЗАКАЗЧЫК — МАСТАЦКІ САВЕТ ● РЭКЛАМШЧЫК, ІНФАРМАТАР ЦІ ТВОР МАСТАЦТВА!.. ● МАГАЗІНЫ «ГАЛОЎНЫЯ» І «НЕ ГАЛОЎНЫЯ».

ЦІ ЁСЦЬ СЭНС зноў вяртацца да размовы пра вітрыны, зноў нагадваць, што ў нас яны афармлены кепска, — толькі ў асобных магазінах больш-менш прыстойныя, а ў астатніх пустыя ці на дзіва сумныя і безгустоўныя?..

Здаецца, сэнс ёсць. І вось чаму.

Зробім просты падлік. Толькі ў адным Мінску каля сямі сотняў магазінаў, майстэрняў, розных кас, аптэк, кафэ, цырульняў, камбінатаў бытавых паслуг, якія маюць вітрыны. Калі памножыць колькасць гэтых устаноў на сярэднюю даўжыню вітрыны (дваццаць метраў) і на сярэднюю вышыню (тры метры) — атрымаецца ўнушальная лічба: сорак два квадратных кіламетры!.. Падкрэсліваю — гэта толькі ў адным Мінску... Зразумела, што такая выставачная плошча здольная ўразіць.

Я не памыляюся, называючы плошчу вітрын выставачнай, бо вітрыны працягнуліся ўздоўж амаль усіх гарадскіх вуліц. Яны на кожным кроку. Вядуць па горадзе. Аб нечым расказваюць. Нешта папулярызуюць. Інфармуюць. Настойліва, штодзённа ўплываюць на наш мастацкі густ. Фарміруюць нашыя ўяўленні аб прыгожым.

Калі прайсціся па Мінску, то ўражанняў будзе амаль дастаткова, каб весці гаворку пра ўзровень афармлення вітрын.

У апошнія гады мы ўсё часцей бачым шырокія шкляныя палосы вітрын, пакінутыя ў першароднай чысціні і пустаце: маўляў, прахожаму прыемна бачыць, што робіцца ў магазіне, ды і багацці прылаўкаў праз такую вітрыну разглядзець зручней. Намер — добры: разгрузіць падобныя на філіялы складаў вітрыны, заваленыя пажоўклымі ад сонца і пылу таварамі, прапусціць у гандлёвыя залы сонца.

Але ж, адмовіўшыся ад безгустоўнасці, не варта адмаўляцца ад вітрын увогуле. Нельга не заўважаць, што над афармленнем вітрын сталі працаваць цікавыя мастакі з вартымі ўвагі творчымі ідэямі. А вось некаторыя кіраўнікі гандлю не жадаюць гэтага заўважаць. А «апошняе слова» ў афармленні вітрын заўсёды за імі. Нават калі работу мастакоў прынялі і адміністрацыя фірмы «Белгандальрэклама» (яна займаецца афармленнем вітрын), і мастацкі савет Мастацкага фонду БССР. З добрым густам, прафесіянальна зробленае афармленне вітрын прападзе дарэмна, калі не спадабаецца заказчыку — дырэктару магазіна або прадстаўнікам гандлю. І хаця ў такой пастаноўцы пытання ёсць нейкая рацыя (мы ж таксама не купляем таго, што нам не падабаецца), усё ж нельга не ўлічваць, што ацэньваць мастацтва (хай сабе «ўсяго толькі» мастацтва вітрын) трэба не па прынцыпу «падабаецца — не падабаецца». Гэтага яўна недастаткова. Трэба мець бездакорны густ, ведаць псіхалогію ўспрыняцця, ды і проста ўмець разбірацца ў мастацтве. Таму і існуе мастацкі савет — найбольш кампетэнтны і найбольш адказны орган у справе ацэнкі працы мастака, у якой бы галіне ён ні працаваў. Зусім натуральна, што да думкі гэтага органа нядрэнна было б прыслухоўвацца і заказчыкам вітрын.

А як бывае на справе?..

Маладыя мастакі зрабілі эскізы вітрын для магазіна «Крышталь». Працавалі многа, сумленна, уклаўшы ў работу душу, фантазію. Прадумалі ўсё — да апошняй дробязі. Мастацкі савет ацаніў гэтую работу на «выдатна»! Прадстаўнікі ж гандлю... адмовіліся прыняць. Чаму? Ды таму, што праз такую вітрыну быццам бы не відаць абсталявання магазіна, не відаць тавару на прылаўках.

А ці абавязкова прахожаму гэта бачыць? Вітрына, хутчэй, павінна прыцягнуць яго ўвагу, зацікавіць, прымусіць зайсці ў магазін. Згадзіцеся, што гэтая мэта куды больш важная, чым проста дэманстрацыя тлуму ля прылаўкаў. Улічыце і тое, што тавар у магазіне «Крышталь» асаблівы—шкло, фарфор, кераміка. На адлегласці ды яшчэ праз галовы людзей, разгледзець яго нельга. Шкло трэба падаць—прыгожа паставіць, асвятліць, каб яно зайграла... Усё гэта і прадугледзелі мастакі. Але гаспадарам магазіна, якія першыя павінны былі б зразумець і ацаніць задуму мастакоў, зробленае не спадабалася. Не спадабалася— і ўсё...

Аўтары даказвалі, пераконвалі... Зараз таксама даказваюць і пераконваюць. А воз, як кажуць, і сёння не зрушыў з месца...

А колькі мастакоў не вытрымала такога напору заказчыка, пайшло ў яго на павадку!.. Ці не гэтым можна растлумачыць, што так многа ў нас вітрын, падобных адна на адну, як дзве кроплі вады?

Шмат у чым вінаватая і адміністрацыя «Белгандальрэкламы», якая ставіцца да мастакоў, быццам да падзёншчыкаў: лепшым лічыцца той, хто зрабіў больш эскізаў. Спаборніцтва за колькасць — завядзёнка добрая. Але нават у вытворчасці гузікаў колькасць адыходзіць на другі план, прапускаючы наперад якасць. Дырэкцыя ж «Белгандальрэкламы» па-ранейшаму мяркуе, што колькасць, колькасць і колькасць — тры кіты, на якія павінна абапірацца ўсякае прадпрыемства. І не вельмі ж у яе, у памянёнай дырэкцыі, ляжыць душа да вітрын. Бо ад вітрын, маўляў, адны турботы, а прыбытку — пшык... Вось газасветлавыя пано— іншая справа!.. Хуткая і прыбытковая!..

Стварыць вітрыну нялёгка. Бо «задачы» ў яе вельмі складаныя. Адны мяркуюць, што вітрына — перш-наперш інфарматар, які павінен расказваць пра тавары ў магазіне, пра іх кошт, якасць. Другім здаецца, што вітрына павінна быць рэкламшчыкам — усімі магчымымі спосабамі прымушаць зрабіць пакупку. Трэція кажуць: «Не! І інфармаваць вітрына павінна, і рэкламаваць, але галоўнае — стварыць мастацкі вобраз магазіна, падаць тавар тактоўна, з выдумкай». Здаецца мне, што бліжэй за ўсё да ісціны гэтыя самыя трэція. Прызначэнне вітрыны шматграннае. Але яна не стане ні дасканалым інфарматарам, ні дасканалым рэкламшчыкам, пакуль не знойдзем для яе адпаведны мастацкі вобраз, пакуль не навучымся як след карыстацца ўласцівай ёй мовай.

А з чаго пачынаць?

Адкажам на пытанне пытаннем: а чаму пачынаць?.. Пачатак жа ёсць, і, здаецца, нядрэнны. Возьмем, для прыкладу, вітрыны магазінаў «Моднае адзенне» і «Мужчынскае адзенне». Абодва магазіны гандлююць вопраткай. Здавалася б, што і вітрыны будуць вырашаны амаль аднолькава. Але мастакі не пайшлі пратаптаным шляхам.

У «Мужчынскім аддзенні» ў вітрынах — элегантныя, «пад барока», пластыкавыя застаўкі, з сілуэтамі дэндзі канца мінулага стагоддзя. Гэта выклікае добрую ўсмешку: гандлююць жа сучасным адзеннем; а ў вітрыне — «нафабраныя» вусы, кацялкі, штаны са штрыпкамі... У той жа час мозг пакупніка пачынае «працаваць» — разгадваць істотны сэнс гэтых застаўак, іх «падтэкст»: а застаўкі выклікаюць пачуццё даверу да магазіна, перакананне ў яго саліднасці, дабротнасці.

Працуючы над вітрынамі «Моднага адзення», мастакі не адмовіліся начыста ад дэманстрацыі тавару — яны размясцілі ў прасценках (паміж галоўнымі плоскасцямі вітрын) некалькі касцюмаў і паліто. Зрабілі гэта тактоўна, быццам ускосна падкрэсліваючы сціпласць, строгасць сучаснай моды. Галоўныя ж экспазіцыйныя плошчы вітрын «Моднага адзення» занялі вялікія прызмы, на якіх — фотаздымкі сучасных жаночых сукенак, футравых манто, шарсцяных касцюмаў. Павольна круцяцца прызмы, а над імі — фотарэпрадукцыі славутых жаночых партрэтаў Леанарда да Вінчы, Бацічэлі, Мадзільяні.

Каму-небудзь, можа, і здаецца, што нетактоўна змяшчаць у вітрынах фрагменты твораў вялікага мастацтва. Але ж гэтыя галоўкі сімвалізуюць неўміручасць, вечнасць жаночай прыгажосці!.. Ці трэба тлумачыць падрабязней?!. Ну, а фотаздымкі адзення на прызмах?.. Не маючы да партрэтаў прамога дачынення, яны намякаюць пакупніку: нішто так трапна не адцяняе жаночую прыгажосць, як элегантная і модная вопратка.

Шкада толькі, што дырэкцыя магазіна не клапоціцца пра захаванне мастакоўскай задумы. Прызмы, якія павінны круціцца, стваючы істотны дадатковы эфект,— часцей за ўсё стаяць. Мабыць, у магазіне змагаюцца за эканомію электраэнергіі і не ўлічваюць, што мастак нічога не прыдумвае толькі дзеля таго, каб прыдумаць...

Але давайце збочым са сталічнага праспекту — дабярэмся да мікрараёнаў, прыгадаем убачанае ў іншых гарадах Беларусі. Вельмі цяжка нам назваць нешта такое, што ўразіла б нас, запомнілася. Звычайна вітрыны адрозніваюцца адна ад другой толькі выкладзенымі на іх таварамі: гэта вось магазін фотатавараў — бо ў вітрыне фотаапараты, а гэта — кнігарня, бо ў вітрыне кнігі. А тут гандлююць абуткам — за шклом дзесяткі са два туфляў, прычым з адной толькі правай нагі...

Гаспадары і стваральнікі «перыферыйных» вітрын, напэўна, думалі, што, пакольні афармляюцца не «галоўныя» магазіны, дык можна абысціся «трэццегатунковай» прадукцыяй. (Дарэчы, не так ужо і складана было б кіраўнікам гандлю зразумець, што для жыхара Пінска або Слуцка менавіта яго пінскі ці слуцкі магазін — «галоўны», а не мінскі...). Але ж і з «галоўнымі» магазінамі справы амаль такія ж. Я прыгадваю вітрыны трох абласных універмагаў — гродзенскага, магілёўскага, віцебскага. Усюды вітрыны вырашаны ў адным і тым жа ключы — выставіць як мага больш тавараў, развесіць, расставіць іх так, каб не засталося ні кавалачка свабоднай вітрыннай плошчы. Гэткі падыход прыносіць і «вынік» — вітрыны сумныя, нецікавыя, безгустоўныя. У адным толькі Бабруйску давялося бачыць мне ля вітрын універмага натоўп. У асноўным гэта былі дзеці. І сабраліся яны ля вітрыны аддзела цацак. Не скажу, што вітрына вызначалася нейкім асаблівым мастакоўскім умельствам, але той, хто яе афармляў, досыць дакладна зрабіў псіхалагічны разлік. У вітрыне стаялі два макеты. На адным — вакол зямнога шару — лёталі ракеты. На другім, як на шырокім танцавальным крузе, павольна перасоўваліся лялькі. Яны кружыліся, сыходзіліся, працягвалі адна адной рукі, разыходзіліся, каб праз нейкі час ізноў паўтарыць свае мудрагелістыя па. Кажуць, што раней такіх вітрын было шмат, нават імя ў іх было — «машынерыя», а потым іх усе паразламвалі. Ну што ж, напэўна, у гэтым быў нейкі сэнс — бо ці ж можна дарослага чалавека здзівіць, напрыклад, відовішчам «бяздоннай» бочкі, з якой па трубачцы ўвесь час цячэ «віно» і не выцякае!.. А вось для дзяцей вітрыны, пабудаваныя па прынцыпу «машынерыі», заўсёды вельмі цікавыя.

Нямала беларускіх гарадоў аб'ехаў я і ўсюды прыглядаўся да вітрын. Не, акрамя гэтай, бабруйскай, ні адна не ўразіла... Чаму?

Стварэннем вітрын ва ўсёй Беларусі афіцыйна павінна займацца фірма «Белгандальрэклама». Але яе «магутнасці» ледзь-ледзь хапае на Мінск. Дзе ўжо там дабрацца да перыферыі. Прафесіянальныя мастакі на месцах займацца вітрынным мастацтвам не вельмі жадаюць: пакут будзе многа, а ўдзячнасці — амаль ніякай. А магазіны не вельмі і настойваюць: маўляў, пакупнікі і так ёсць, агітаваць асабліва нікога не даводзіцца.

Але напэўна ж нельга забываць, што вітрына належыць не толькі магазіну. Вітрына — гэта важны элемент гарадскога экстэр'ера. Бывае, што з-за дрэннай вітрыны цэлы гарадскі квартал — шэры, сумны, непрыгожы. Хіба не так на тым адрэзку Ленінскага праспекта ў Мінску, дзе — салон-магазін Мастацкага фонду БССР?... Вось хто мог бы ўразіць выдатнай вітрынай, зрабіць яе прыкладам для ўсіх. Але зірніце на бруднае шкло. На абрыўкі пазалеташніх афіш... Сорамна за магазін, за яго гаспадара.

Сорак два квадратныя кіламетры адведзены ў адным толькі Мінску пад «выстаўку», якая павінна інфармаваць, уплываць на нашы густы. А колькі такіх «выставак» у іншых гарадах рэспублікі!

Як жа мы скарыстоўваем гэтую выставачную плошчу? Пакуль што безгаспадарча!..

А. БЕЛАВУСАЎ.

І ЗНОЎ—ПРА КАХАННЕ...

СПЕКТАКЛЬ ДРАМАТЫЧНАГА ГУРТКА МІНСКАГА КАМВОЛЬНАГА КАМБІНАТА

Сцэна са спектакля «Увесь дом уверх дном». У ролі Тані—Люда Ляўковіч, Ігара—Анатоль Бондар, Валодзі—Алег Скаромны.
Фота Ул. КРУКА.

ЖЫВУЦЬ на свеце двое маладых людзей — Таня і Ігар. У іх першае каханне. І трэба ж здарыцца, каб гэтаму перашкодзіў... звычайны вясенні дождж. А можа і не дождж. Ноччу ў парку закаханыя сустрэлі «бяздомнага» чалавека — ім аказаўся студэнт-завочнік, шахцёр Валодзя з Поўначы, які з-за нямецкай мовы ніяк не можа «пералезці» на трэці курс. Таня вырашыла дапамагчы чалавеку. І тут пачаўся дождж. Насуперак усялякай мяшчанскай маралі спагадлівая дзяўчына прывяла Валодзю ў дом дзядзькі, потым дапамагла рыхтаваць экзамены, падтрымала хлопца ў цяжкую хвіліну і г. д. У выніку ўсіх гэтых перыпетый нарадзілася новае каханне, а эгаіст Ігар, які быў абыякавым, не рваўся дапамагчы чалавеку, застаўся пры сваіх інтарэсах.

Сюжэт і канфлікты вельмі знаёмыя. Яны вандруюць з п'есы ў п'есу, якія звычайна аўтары называюць «лірычнай камедыяй». На гэты раз мы маем на ўвазе твор В. Канстанцінава і Б. Рацэра «Пасля 12-ці». Наўрад ці варта падрабязна спыняцца на аналізе камедыі, якая ўжо даўно ставіцца на нашай сцэне. Яна мае на мой погляд і свае дадатныя якасці і шэраг недахопаў. Але п'еса крытыкуе мяшчанскую мараль, услаўляе чалавекалюбства і таварыскую ўзаемадапамогу і таму вартая ўвагі.

Гэта і прывабіла самадзейны тэатральны калектыў Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната, які нядаўна сыграў прэм'еру камедыі. Праўда, аматары памянялі старую назву, і значыцца яна цяпер на афішах «Увесь дом уверх дном».

Сярод многіх аматарскіх калектываў Мінска драматычны гурток камвольшчыкаў, відаць, самы малады як па складзе ўдзельнікаў, так і па сваёй творчай гісторыі. Пачаў ён сваю дзейнасць у 1964 годзе, складаецца сёння з 24 чалавек, кіруе калектывам самадзейны рэжысёр Г. Жаркоў. Спачатку ставіліся аднаактоўкі, пасля больш складаныя поўнаметражныя п'есы: «Іголка і штык» А. Галіева і «Бой з ценем» В. Тура. Спектаклі гэтыя на двух апошніх гарадскіх аглядах атрымалі высокую ацэнку.

Добра, што рэжысёр Г. Жаркоў не ставіў перад сабой і ўдзельнікамі спектакля «Увесь дом уверх дном» задачы стварыць усяго толькі пацешнае відовішча, як прычыну для бяздумнага адпачынку. Пры ўсёй лёгкасці жанру і невераготнасці падзей рэжысёр і выканаўцы асаблівую ўвагу звяртаюць на той выхаваўчы зарад, які ёсць і ў п'есе. У выніку атрымалася не толькі вясёлая, але і карысная работа, якая зойме сваё месца ў рэпертуары калектыву.

Разам з тым, хацелася б зрабіць і некаторыя заўвагі, у першую чаргу ў адрас рэжысёра. Незразумела, навошта спатрэбілася механічна пераносіць дзеянне з Масквы ў Мінск? П'еса не становіцца больш цікавай, нічога не дае гэта і спектаклю. Беспадстаўна зменена і назва п'есы. Не скажам, што яна ў аўтараў вельмі ўдалая, але не лепшая і тая, што зараз значыцца на афішы.

Варта ўвогуле яшчэ папрацаваць над спектаклем — і па рэжысёрскай лініі, і па акцёрскай. Мабыць, спектакль яшчэ «разыграецца», выканаўцы адчуюць сябе вальгатней, але пастаноўшчыку варта звярнуць увагу на тое, што ў многіх з іх пакуль што вельмі бедны інтанацыйны лад мовы, яны спяшаюцца выпальваць тэкст, часам асобных слоў і рэплік не чуваць у зале. Не дрэнна было б удакладніць грым, асобныя дэталі рэквізіту, касцюмаў, звярнуць увагу на агульны рытм спектакля, які пакуль што вельмі запаволены, часта парушаецца неапраўданымі паўзамі.

Зараз самадзейны калектыў заняты падрыхтоўкай да новай пастаноўкі, якая прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, гэта будзе п'еса І. Папова «Сям'я». Шэфы — Рускі драматычны тэатр БССР імя Горкага — абяцаюць аказаць дзейсную дапамогу, а спектакль бярэцца паставіць заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Даброцін. Перш чым прыступіць да рэпетыцый, самадзейныя артысты пабываюць на радзіме Ільіча — ва Ульянаўску.

С. ПЯТРОВІЧ.

ГУЧЫЦЬ У МАГІЛЁВЕ ПЕСНЯ

Выступае адна з пераможцаў конкурсу выхавацельніца дзіцячага сада з г. Бабруйска Алена Петухова. Ёй прысуджаны галоўны прыз.

Два дні ў Магілёве праходзіў абласны конкурс маладых спевакоў на лепшае выкананне савецкай песні, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Конкурс праводзілі абласны камітэт камсамола, абласное ўпраўленне культуры і абласны камітэт радыёвяшчання.

Абласному конкурсу папярэднічалі раённыя і гарадскія конкурсы, у якіх прыняло ўдзел каля дзвюх тысяч чалавек. У абласным жа конкурсе ўдзельнічала 38 юнакоў і дзяўчат—пераможцаў раённых і гарадскіх конкурсаў.

На конкурс быў прадстаўлены цікавы, змястоўны і разнастайны рэпертуар. Яго аснову склалі лепшыя мелодыі савецкіх кампазітараў і фальклору. Гэта песні аб камсамольцах—удзельніках грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, аб маладых будаўніках, хлебаробах, аб нашай цудоўнай Радзіме.

З удзельнікаў конкурсу ў першую чаргу патрэбна адзначыць выхавацельніцу дзіцячага сада з горада Бабруйска Алену Петухову. Голас спявачкі гучыць свабодна, плаўна. У яе манеры спявання ўражвае шчырасць, задушэўнасць пачуццяў.

Паланіла слухачоў салістка маладзёжнага жаночага ансамбля «Аэліта» Дома культуры швейнікаў Людміла Корсак. Мяккаму і задушэўнаму голасу Люды ўласціва пранікнёнасць, уменне перадаць самую сутнасць музычных вобразаў.

Прыемнае ўражанне ў членаў журы і слухачоў пакінула самая юная спявачка з Дома піянераў і школьнікаў горада Магілёва Галя Верабей.

Паспяхова выступілі на конкурсе студэнт Магілёўскага музычнага вучылішча Генадзь Чэпікаў, студэнт аграномічанга факультэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Васіль Сахараў, малады ўрач з Асіповіч Уладзімір Злобіч, салістка харавой капэлы Дома настаўніка горада Бабруйска Святлана Бруснічкіна і многія іншыя.

А. ГОЛЫШ.

КІНО

СТАРОНКІ АДНАГО ЖЫЦЦЯ

НОВЫ дакументальны фільм «Мне хацелася расказаць», пастаўлены ў творчым аб'яднанні «Летапіс» студыі «Беларусьфільм» рэжысёрам В. Чацверыковым па сцэнарыі, які напісаў ён сам разам з журналістам В. Марозавым, расказвае пра чалавека незвычайнага лёсу — Арыядну Іванаўну Казей.

...Дваццацігадовая беларуская партызанка Арыядна (ці проста Ада, як яе звалі таварышы) пасля ранення трапіла ў шпіталь. Тут яе лёсам зацікавіўся нампаліт шпіталю Барыс Аляксандравіч Касцюкоўскі, пачынаючы тады пісьменнік. Неўзабаве ён апублікаваў у газеце нарыс «Старонкі з жыцця Ады Казей».

З таго часу прайшло чвэрць стагоддзя. Заслужаная настаўніца БССР, Герой Сацыялістычнай Працы Арыядна Іванаўна Казей і пісьменнік Барыс Касцюкоўскі сустрэліся зноў. І адбылася гутарка, нібы працяг той, што некалі пачалася ў шпіталі. Камера дакументалістаў стала сведкай гэтай сустрэчы і яе каментатарам. Гледачу адкрываюцца старонкі гераічнага непаўторнага жыцця.

Дзесяць мінут працягваецца на экране гэты нявыдуманы расказ — і амаль усё жыццё гераіні праходзіць перад намі. Пастаноўшчыкам у гэтай кароткаметражнай стужцы ўдалося стварыць вобраз чалавека багатай душы — па-мастацку абагулены вобраз патрыёта і адначасова канкрэтны партрэт сучасніка, аднаго з многіх.

Фільм пачынаецца традыцыйна. Да дзесяцікласнікаў у госці прыйшоў пісьменнік Б. Касцюкоўскі. Ён гаворыць пра Арыядну, пра дзяўчыну без ног, пра яе мужнасць і подзвіг. Але вось у размову ўступае сама Арыядна. Мы чуем яе голас. Гэта роздум аб сабе, аб часе, аб людзях. Перад намі на экране праходзяць эпізоды, поўныя драматызму. Арыядна ўспамінае пра свайго бацьку, былога чырвонага матроса Балтыйскага флоту, удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Вось бацька памёр»... — проста, нават будзённа гаворыць Арыядна Іванаўна. І ўспамінае маці, той момант, калі ў кастрычніку 1941 года яе вялі па вясковай вуліцы гітлераўскія карнікі. Маці пакаралі смерцю за дапамогу параненым савецкім байцам. «Мне думалася, — працягвае Арыядна Іванаўна,— што страціўшы самых дарагіх, самых блізкіх мне людзей, бацьку і маці, на гэтым відаць, закончацца ўсе выпрабаванні майго лёсу...»

Часта ў нашых фільмах атрымліваецца, што знаёмства гледачоў з героем карціны застаецца ўмоўным, яго бачыш нібы збоку. У стужцы «Мне хацелася расказаць» аўтары сцэнарыя і рэжысёр В. Чацверыкоў праяўляюць сапраўдную, шчырую цікавасць да сваёй гераіні. Яны хочуць зразумець вытокі мужнасці гэтай жанчыны, раскрыць маральна-псіхалагічныя матывы яе ўчынкаў. Гэта і ёсць прыкметы сапраўднага мастацтва.

Жыццё Арыядны Казей дае аўтарам матэрыял выключнага эмацыянальнага ўздзеяння. Карыстаюцца яны гэтым матэрыялам вельмі асцярожна, не стараючыся драматызаваць і без таго драматычны лёс. Іх мэта— паказаць нашу сучасніцу як асобу, паказаць яе шматгранны характар. І гэта ім увогуле ўдаецца.

Рэжысёр В. Чацверыкоў і аператар В. Арлоў здымаюць Арыядну Іванаўну ў школе, дома, у музеі, у месцах, звязаных з дзяцінствам, здымаюць буйным планам, рэдка ўжываючы мантажныя «перабіўкі». Бо партрэт гераіні — галоўнае ў гэтым кароткім фільме-маналогу.

Расказ, які ідзе ад першай асобы, узмацняецца даверлівым, задумлівым і задушэўным голасам Арыядны Казей.

Можа, на паперы словы не прагучаць так узрушана, як у фільме, але мне хочацца прывесці расказ гераіні аб гібелі яе брата Марата.

— Калі я ехала са шпіталя дамоў, я радавалася таму, што сустрэну Марата. Бо ў мяне ёсць брат, сябар, аднапалчанін. І зусім выпадкова, па дарозе ў Дзяржынск у поездзе я пачула расказ невядомага мне чалавека аб гібелі партызана, які, акружаны ворагамі, падарваў сябе на апошняй гранаце... У гэтыя хвіліны я не ведала, што размова была якраз пра Марата...

Выяўленчы лад гэтай часткі маналога на дзіва ёмісты. На экране пейзажы, якія ствараюць атмасферу светлага смутку. Мы бачым Арыядну Іванаўну з сынам ля помніка Марату Казею. Некалькі статычных планаў паказваюць палатно мастака, які адлюстраваў подзвіг юнага партызана. Потым дзеянне пераносіцца ў музей. На стэндзе — наган Марата. Запаволеная панарама — на Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Марату Казею звання Героя Савецкага Саюза. Мы, гледачы, нібы дакранаемся да таго, што было яго, Марата, жыццём і лёсам.

Аўтары карціны не захапляюцца знешнім, эфектным бокам жыцця гераіні. Толькі ў фінале фільма мы даведваемся, што Арыядна Казей—заслужаная настаўніца БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, дэлегат Усесаюзнага з'езда настаўнікаў, актыўны грамадскі дзеяч.

— Я ведаю, — гаворыць у апошніх кадрах карціны Арыядна Іванаўна, — што многіх цікавіць, як я змагла заняць дастойнае месца ў жыцці... — І адказвае: — Памяць аб тых, каго беззваротна забрала вайна, не дазволіла мне быць іншай...

Усё смялей ад фільма да фільма, адкідваючы кінематаграфічныя штампы, ілюстрацыйнасць, найграны пафас, якія былі ўласцівыя дакументальным карцінам ранейшых гадоў, рухаецца беларуская кінапубліцыстыка да сапраўды мастацкага асэнсавання жыцця такім, якім яно ёсць. Пацверджаннем гэтага з'яўляецца хвалюючая, у многім арыгінальная па кінапрыёмах стужка «Мне хацелася расказаць».

Яўг. КРУПЕНЯ.

Казімір БУСЛАЎ

ВЯЛІКІ ТВОР МАРКСІЗМА

ДА 60-ГОДДЗЯ ВЫХАДУ Ў СВЕТ КНІГІ У. І. ЛЕНІНА «МАТЭРЫЯЛІЗМ І ЭМПІРЫЯКРЫТЫЦЫЗМ»

Шэсцьдзесят гадоў назад у Маскве асобнай кнігай выйшаў у свет вялікі твор марксісцкай філасофіі, галоўная філасофская праца Уладзіміра Ільіча Леніна — «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм».

Кніга «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» напісана Леніным у гады рэакцыі. Пасля падаўлення рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі, паводле слоў К. А. Ціміразева, усе цёмныя сілы апалчыліся супраць дзвюх сіл, якім належыць будучыня: у галіне думкі—супраць навукі, у жыцці—супраць сацыялізма.

Рэакцыя, якая лютавала ў Расіі, супала з усталяваннем імперыялістычнай стадыі капіталізму, калі буржуазія ва ўсіх краінах, паводле слоў Леніна, крута паварочвала ад дэмакратыі да «рэакцыі па ўсёй лініі», г. зн. у эканоміцы, палітыцы, ідэалогіі. Гэтая новая паласа, пісаў Уладзімір Ільіч, «не выпадковасць, а своеасаблівая ступень у капіталістычнай эвалюцыі краіны».

У канцы XIX—пачатку XX стагоддзя ў Еўропе распаўсюдзілася філасофія «крытычнага вопыту» — эмпірыякрытыцызм, або махізм, які прыкрываў новай тэрміналогіяй ідэалізм і агнастыцызм. Філасофія махізму, замаскіраваная пад навуку, уяўляла з сябе вытанчаную форму суб'ектыўнага ідэалізму. Мэта яе зводзілася да абвяржэння марксісцкага філасофскага матэрыялізму і дыялектыка-матэрыялістычнай тэорыі пазнання.

Махізм, змыкаючыся з англійскім спірытуалізмам, нямецкім ідэалізмам, французскім фідэізмам, апраўдваў рэлігію, ён быў глыбокімі каранямі звязаны з ёй. Аб'ектыўная класавая роля эмпірыякрытыцызму цалкам зводзілася да прыслужніцтва фідэістам у іх барацьбе супраць матэрыялізму наогул і супраць гістарычнага матэрыялізму, у прыватнасці.

З самага пачатку распаўсюджвання махізму ў Расіі Ленін звяртаў увагу на неабходнасць рашучай барацьбы з ім. Ён заклікаў Пляханава і Аксельрода выступіць супраць глумлення з філасофіі марксізма з боку паслядоўнікаў махізму ў Расіі — Багданава, Базарава, Валянцінава, Юшкевіча, Луначарскага і іншых, хто спрабаваў з сацыялізма зрабіць новы від рэлігіі і аб'яўляў энгельсаўскія палажэнні аб дыялектыцы містыкай. Пляханаў выступіў супраць махістаў, але яго крытыка насіла абмежаваны характар. У пісьме да Горкага Ленін пісаў: «Пляханаў *цалкам* мае рацыю супраць іх па сутнасці, толькі не ўмее або не хоча або лянуецца сказаць *канкрэтна,* грунтоўна, проста, без залішняга запалохвання публікі філасофскімі тонкасцямі. І я ў што б там ні стала скажу гэта *па-свойму*».

У кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» Ленін разграміў махізм тэарэтычна і ідэйна, паказаў яго рэакцыйную сутнасць, выкрыў спробы махістаў рэвізаваць і сказіць марксізм. Аналізуючы дасягненні навукі, ён растлумачыў і паглыбіў асноўныя пытанні дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, даў матэрыялістычнае тлумачэнне навейшым адкрыццям прыродазнаўства. Ленінская праца адыграла выдатную ролю ў ідэйным узбраенні партыі — яна з'явілася тэарэтычным абгрунтаваннем палітыкі, стратэгіі і тактыкі бальшавіцкай партыі на ўвесь перыяд барацьбы за сацыялістычную рэвалюцыю, вострай зброяй у барацьбе супраць усіх спроб скажэння марксізма.

Канец XIX і пачатак XX стагоддзя азнаменаваліся сапраўднай рэвалюцыяй у прыродазнаўстве. Глыбокі пераварот у поглядах на прыроду супаў з грамадска-палітычнай рэакцыяй у сувязі з пераходам капіталізму ў імперыялістычную стадыю. Ва ўмовах бурнага развіцця прыродазнаўства ідэалістычная філасофія, разглагольствуючы аб «дэматэрыялізацыі атама» і аб «знікненні матэрыі», спрабавала даказаць, што аб'ектыўная рэальнасць не існуе па-за свядомасцю, інакш кажучы, спрабавала замяніць матэрыялізм ідэалізмам і агнастыцызмам. Пры гэтым Ленін адзначаў той факт, што найменшае хістанне філосафаў і даследчыкаў прыроды ў бок ідэалізму рэакцыя выкарыстоўвае ў мэтах умацавання пазіцый імперыялізму.

У. І. Ленін матэрыялістычна вытлумачыў і абагульніў новыя дасягненні навукі аб прыродзе: ён узбагаціў паняцце асноўнага пытання філасофіі, даў класічнае вызначэнне матэрыі, адчування, развіў тэорыю адлюстравання, раскрыў складаны працэс пазнання, звярнуўшы асаблівую ўвагу на пытанні ісціны і практыкі.

У барацьбе супраць махізму Ленін прааналізаваў сутнасць крызісу ў фізіцы, раскрыў сутнасць «фізічнага ідэалізму» як міжнароднай ідэйнай плыні, якая выцякае з агульных прычын, што ляжаць па-за філасофіяй. Адначасова Ленін указаў шляхі выхаду з крызісу ў фізіцы, вылучыўшы палажэнне аб невычарпальнасці матэрыі, аб якаснай мнагастайнасці матэрыі і форм яе руху, даўшы матэрыялістычнае вытлумачэнне праблемам прычыннасці, прасторы, часу, свабоды і неабходнасці. Ленін геніяльна прадказаў напрамак развіцця прыродазнаўства шляхам адкрыцця больш складаных форм руху матэрыі, новых заканамернасцей, стварэння больш складанай карціны свету як рухомай матэрыі. Гэтыя ленінскія ідэі пацверджаны ў нашы дні рэвалюцыйным пераваротам у навуцы і тэхніцы.

У кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» раскрыта непарыўнае адзінства дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, звернута асобая ўвага на немагчымасць атаесамлівання, як гэта рабіў Багданаў, быцця і свядомасці. Ленін пры гэтым падкрэсліваў, што грамадская свядомасць адлюстроўвае грамадскае быццё — гэта агульнае палажэнне ўсяго матэрыялізму.

Да асноўных палажэнняў гістарычнага матэрыялізму, асабліва ў галіне такіх форм грамадскай свядомасці, як філасофія, навука, мастацтва, Ленін прымяніў развітую ім тэорыю пазнання — матэрыялістычную тэорыю адлюстравання.

Пазнанне аб'ектыўнага свету, дзякуючы адчуванням, здзяйсняецца ў выглядзе вобразаў. Адчуванне — гэта суб'ектыўны вобраз аб'ектыўнага свету. Найвышэйшай формай мастацтва таму можа быць толькі мастацтва рэалістычнае, якое заключае ў сабе аб'ектыўную ісціну. Не сімвалы, не ўмоўныя знакі, а рэалізм у мастацтве набліжае чалавека да пазнання навакольнага свету, сацыяльнай рэчаіснасці. На аснове матэрыялістычнай тэорыі адлюстравання Ленін раскрыў мастацкую і ідэйную негрунтоўнасць дэградуючага буржуазнага мастацтва ў выглядзе натуралізму, фармалізму, сімвалізму і іншых рэакцыйных плыняў.

У. І. Ленін развіў філасофскія асновы рэалістычнага мастацтва і непасрэдна звязаў яго з задачамі барацьбы рабочага класа за сваё эканамічнае, палітычнае і духоўнае вызваленне. Глыбока абгрунтаваўшы прынцып партыйнасці мастацтва, ён сарваў маску з тэорыі «чыстага мастацтва», паказаў негрунтоўнасць размоў аб незалежнасці мастацтва ад грамадства, аб ізаляванасці творчасці мастака ад інтарэсаў пэўнага класа. Сапраўдная свабода мастацкай творчасці, падкрэсліваў Ленін, магчыма толькі тады, калі мастацтва служыць народу, справе барацьбы за рэвалюцыйнае пераўтварэнне свету.

Агульнавядома велізарная пазнавальная і пераўтваральная сіла сацыялістычнага мастацтва, яго актыўная роля ў жыцці грамадства. І гэта вынік таго, што яно апладатвараецца во-

Літаратура і мастацтва 2
Пятніца, 16 мая 1969 года.

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

Кніжная паліца

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь»: «Незнарон і знарок» В. Гарбуна (мастак П. Калінін), «Жураўліны досвітак» У. Карызны (мастак М. Пранапенка), «Птушыная трывога» І. Васілеўскага (мастак В. Кандэр).

Водгукі, адказы

ПАСЛЯ АРТЫКУЛА «ПАВІСЛІ Ў ПАВЕТРЫ»

У артыкуле Э. Красоўскага «Павіслі ў паветры», надрукаваным у нашай газеце 25 сакавіка г. г., ішла гаворка аб недахопах у арганізацыі падрыхтоўкі кінамеханікаў.

Намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі П. Жукоўскі піша ў рэдакцыю, што артыкул правільна ўзнімае шэраг пытанняў, якія патрабуюць вырашэння Дзяржаўным камітэтам Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі і Дзяржаўным камітэтам па прафтэхадукацыі.

Камітэт абавязаў управіленні кінафікацыі прыняць усе неабходныя меры, каб на месцах забяспечваўся падбор і накіраванне кандыдатаў у вучылішчы кінамеханікаў. Па просьбе камітэта Савет Міністраў БССР дазволіў увесці ў штаты абласных управленняў кінафікацыі пасады інжынера па падрыхтоўцы кадраў. У бліжэйшы час будуць разгледжаны пытанні арганізацыі вытворчай практыкі навучэнцаў прафтэхвучылішч кінамеханікаў непасрэдна на кінаўстаноўках.

Разам з тым П. Жукоўскі адзначае, што артыкул артыкула аб некаторых рэчах разважае суб'ектыўна. Дзяржкамітэт па кінематаграфіі БССР устанавіў дапамагае вучылішчам у забеспячэнні вучэбных лабараторый неабходным кінатэхнічным абсталяваннем і запаснымі часткамі. Прадстаўнікі камітэта ўзначальваюць дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі пры вучылішчах кінамеханікаў.

Камітэт лічыць немэтазгодным ліквідаваць у канцэрты вучнёўства і дзяржаўныя кваліфікацыйныя камісіі пры абласных управленнях кінафікацыі: вучылішчы пакуль што не могуць поўнасцю забяспечыць кінасетку спецыялістамі, іх даводзіцца рыхтаваць і іншым шляхам.

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

ладзь, новая пара стучаецца ў акно — і літаратура прыкметна становіцца новай, іншай.

Крытык недакладны ўжо ў тым, што для дэманстрацыі дасягненняў выбірае «сур'ёзную» літаратуру, для ілюстрацыі ж недахопаў жанру ў пераважнай трапляе, за невялікім выключэннем, тое, што мы называем няласкавым словам белетрыстыка. Водападзелу паміж літаратурай і нелітаратурай не праводзіцца.

Але пагрэшнасці аналізу нават не ў гэтым. Нават апавяданні, аднесеныя крытыкам у лік удач леташняй навелістыкі, чымсьці істотным не задавальняюць патрабаванняў, што ставіць да жанру апавядання В. Бураў. Чым? Відаць, сваёй нетрадыцыйнасцю.

Вось хоць бы апавяданне «Дзікі голуб» В. Адамчыка, безумоўна, лепшае з апавядальных твораў апошняга часу. Асаблівай строгасці сюжэта вы ў ім не знойдзеце. Галоўны цэнтр — фокус твора — не гісторыя жыцця цэнтральных герояў, як гэта было характэрна для ранейшых навел, а нешта, адчуваем мы, істотна іншае.

Ну, а самі характары? Хто ён, гэты Марцін Дзікуць, што стаіць у цэнтры твора? Разам з той гуманістычнай любасцю да ўсяго жывога, з якой Марцін праходзіць па жыцці, у ім

ПАХВАЛА ЖАНРУ

ужываецца і самае паганае: ён бывае нячысты на руку.

Вядома, усё гэта можа здацца з рэпертуару «маленькіх чалавечкаў», з іх «абмежаваным светапоглядам». Які ўжо з Марціна «чалавек-творца»? Ён сапраўды «не ведае, чаго хоча і да чаго імкнецца». І ўсё ж кожны, хто ўважліва чытаў «Дзікага голуба», абавязкова скажа, што ў апавяданні ёсць нешта большае, нешта такое, што ўзнімае над ардынарнасцю жыццёвага факта і няпростае жыццё Марціна Дзікуця, яго замілаванасць да жыцця, яго недарэчную непрактычнасць, нават яго смерць ад рукі бязлітаснага, з нейкімі жывёльнымі інстынктамі вяскоўца Клемуса Войны, у кім ніколі і не прачыналася людское, духоўнае. Да ўсяго гэтага ў творы ёсць вялікая маральная мера лірычнага героя, апавядальніка — сённяшняга гараджаніна, у якім прачнуліся па-новаму інтэнсіўнае адчуванне роднасці з зямлёю і яркасць памяці аб вясковым дзяцінстве, аб прыродзе. І яшчэ ёсць у апавяданні яго лірычнага героя бацька і маці — добрыя, пастарэлыя людзі, якія так сур'ёзна і так значна адчуваюць, што ім на змену прыходзіць новае пакаленне, моладзь, сярод якой, дарэчы, ёсць і сын Марціна Дзікуця, які вывучыўся на геолага, і Войнаў старэйшы — брыгадзір у калгасе.

Як на першае беглае прачытанне, дык апавяданне Адамчыка здаецца раскіданым, несабраным у сюжэтным сэнсе. Але паспрабуйце «выраўняць» сюжэт, зняць лірычныя адступленні, абсекчы гэтае мноства жыццёвых сувязей, што крыху цягнуць убок дзеянне, апусціць шматлікія падрабязнасці, якія існуюць у творы толькі дзеля настрою. Гэта будзе згубная для твора аперацыя, бо, можа, дзякуючы якраз гэтым падрабязнасцям і дадатковым планам расказаная пісьменнікам «крымінальная» гісторыя набыла істотнасць глыбокай чалавечай гісторыі, сутнасць якой — у вельмі ўважлівым падыходзе да самай малой дробязі жыцця, у пільнай маральнай праверцы ўсяго, што адбываецца пры нас і вакол нас.

СЁННЯ ўся літаратура зрабілася неяк асабліва ўважлівая да маральна-эстэтычных праблем. І незалежна ад таго, ці гэта апавяданне І. Навуменкі «Раман з эпілогам», ці гэта творы аўтараў маладзейшых — «Свет Іванавіч — былы донжуан» М. Стральцова або «Сяструха» А. Кудраўца, — у іх абавязкова, калі не асноўнай, дык другой, дадатковай тэмай гучыць гуманістычны матыў маральнага ўдасканалення, маральнай адказнасці чалавека.

Сёння, калі «ўшчыльненасць» жыцця і чалавечых узаемаадносін стала надзвычайнай, калі ні адзін лёс не застаецца не пераплеценым тысячамі сувязей з лёсам планеты, калі над зямлёй навісла пагроза атамнай катастрофы, праблема маральнай адказнасці і маральнага ўдасканалення чалавека паўстае з новай сілай і новай неабходнасцю.

І той зварот да дзяцінства, да прыроды ў творах нашых апавядальнікаў, які В. Бурану здаецца недарэчным, мне ўяўляецца невыпадковым і апраўданым. Вядома, калі пісьменнік апісвае факты дзяцінства як проста мілыя ўраванні, як ідылічныя сны, то — і тут можна пагадзіцца з крытыкам — жыццёвае ворыва атрымліваецца неглыбокім. І зусім інакшая справа, калі дзяцінства праглядваецца праз усю таўшчыню пражытых гадоў, як гэта мы назіралі ў памянёным апавяданні В. Адамчыка. У драбнатэм'і такое апавяданне ніяк не абвінаваціш. І не толькі таму, што ў творы, хоць у падтэксце, прысутнічаюць, апрача сучаснага, планы мінулага і будучыні. Сама па сабе пара маленства і маладосці ўяўляюцца мне вельмі паказальнымі ў чалавечым жыцці, бо ў чысціні і незамутненасці адчуванняў, у гульні жыццёвых сіл маладой пары, як бы ў ідэале, выблісквае, мроіцца нам тое, што чалавеку пазней, у практычным і цяжка нялёгкім жыцці, неабходна сцвердзіць і дасягнуць праз свой вопыт. К. Паустоўскі слушна пісаў, што юнацтвам, як крытэрыямі чалавек праверае сваё далейшае жыццё.

В. Бурану, як нядзяжка заўважыць, падабаюцца канфлікты аголеныя, страсці бурныя, ледзь не шэкспіраўскія. Але што ж паробіш, калі жыццё з яго складанымі і драматычнымі праблемамі працякае прытоена, ідзе некаторымі сваімі плынямі ў паўсядзённасць, «хаваецца» ў побыце, як хаваюцца ў пясок, у глебу вялікія воды.

Ды і чаму мы павінны браць за эталон у класічных творах толькі вонкавае, займальнае: моцную інтрыгу, гранічны напал страсцей і г. д. Хоць гэтыя элементы цельга таксама скідваць з уліку, але, як мне здаецца, сённяшняй літаратуры варта вучыцца ў класікаў умельству глыбіннага маральнага і філасофскага пранікнення ў жыццёвую сутнасць, што, уласна, і робіць класіку класікай.

Звычайная любоўная інтрыга паміж Атэла і Дэздэмонай і Яга нам часамі засціць найглыбейшы маральна-філасофскі сэнс шэкспіраўскай трагедыі. Вось як інтэрпрэтуе «Атэла» перакладчык Шэкспіра на рускую мову Б. Пастэрнак: «У Атэла і Дэздэмоны ўсё без астатку сапраўднае. Калі іх паўната і праўда сутыкаюцца з падробным і выдуманым светам Яга, яны гінуць ад лішку сваёй сапраўднасці, ад свайго ўнутранага багацця.

Замест Яга-ліхадзея можна было б уявіць сабе іншага Яга, які сапраўды быў бы тым недвухаблічным добразычліўцам, якім ён сябе выстаўляе. І ўсё адно ён быў бы пракляццем Дэздэмоны і Атэла і зброяй іх пагібелі. Важна не тое, што Яга — паклёпнік і злачынца, а тое, што ён гасіцель жыцця, што на суседству з іскрыстым горнам самабытнасці ён злавесна бясплённы і бяздарны».

Адна з асабліва плённых тэндэнцый сённяшняй літаратуры — яе агульны накірунак да натуральнасці, дакладнасці ў знешняй форме. У сённяшнім апавяданні жыццёвы факт менш «загорнуты», калі можна так сказаць, у жанр, у ім менш умоўнасці, менш вытрыманы жанравыя каноны. Канечне, апавяданне з абсечанымі пабочнымі жыццёвымі ходамі, са стройна лакалізаваным сюжэтам чытаецца лепш, яно больш «літаратурнае». Але сённяшніх нашых апавядальнікаў рэчаіснасць цікавіць з усімі яе карэнькамакамі, з усёй глебай. У такіх творах, як «Надпіс на зрубе» Я. Брыля, «Раман з эпілогам» І. Навуменкі, «Кароль Нябожа» В. Адамчыка, ранейшая апавядальная форма як бы «размыта», але мы толькі павінны вітаць такое разбурэнне ранейшых перагародак, якое ўзмацняе сувязі апавядання з жыццём, пашырае ёмкасць вобраза.

І яшчэ адна рыса сённяшняй прозы, з-за якой можа здавацца «несюжэтным» у ранейшым разуменні сённяшняе апавяданне. Справа ў тым, што пераважная большасць апавяданняў Я. Брыля, І. Навуменкі, М. Стральцова, В. Адамчыка напісаны ў манеры лірычнай прозы. А гэтая «модніца», як вядома, у сваім развіцці прарабіла такія відазмяненні ў сюжэце, што ён стаў мала падобны на ранейшы, калі не сказаць, што яго наогул няма ў традыцыйным разуменні.

ДЗІВОСНЫ, аб'ёмны, нейкі надзвычай чуйны да рэчаіснасці, да матэрыялу жанр — апавяданне, яно развівае ў пісьменніка надзвычайнае пачуццё формы і ўменне канцэнтраваць змест, і гэтыя яго якасці застаюцца яшчэ і сёння загадкай для даследчыкаў. Лічыцца, што ў сапраўдным, змястоўным апавяданні ўвабрана, сканцэнсавана столькі зместу, што яго можна разгарнуць у аповесць і нават у раман. Але ж дзіўныя яны, законы мастацкага сцягвання, канцэнтрацыі матэрыялу! І ці сапраўды апавяданне — гэта канцэнтраваная аповесць або раман у зародку?

Мне ўяўляецца, што майстэрства апавядальніка — гэта зусім не ўмельства «сцягваць» шырокі матэрыял у невялічкі вузел. Звужэнне, канцэнтрацыя тут у іншым. У апавяданні мастацкае асвятленне засяроджана на адным, двух, большае — на трох момантах жыцця, якія ў рамане адпавядалі б нейкім эпізодам. Але гэта больш, чым толькі раманныя эпізоды. У апавяданні, ва ўсякім выпадку ў сённяшнім апавяданні, ёсць і такія эпізоды, што папараднічалі жыццю героя, але яны праходзяць падтэкстам і толькі там-сям памечаны ў тэксце скупымі рэмаркамі.

Вельмі добра адчуваў гэтыя законы апавядальнай лаканічнасці Э. Хемінгуэй. Напісаўшы рэч, ён пасля свядома выкідваў цэлыя кавалкі, пераходы, усё, без чаго можна паспрабаваць абысціся. І па закону закончанай структуры апушчаныя часткі, прачытаўшы «жыць», нябачна як бы прысутнічалі ў падтэксце.

Аднак выводзіць азначэнне апавядання з прыроды вялікіх форм было б няправільна, хоць мы вельмі часта ў сваіх тэарэтычных высновах імёны так і робім. У сапраўднасці ж апавяданне — спецыфічна самастойны жанр, які, да таго ж, калі нагадаць шлях прозы ад французскага фабльо, нямецкіх шванкаў ці нават нашых беларускіх народных казак да буйных эпічных палотнаў, можна лічыць найбольш ранняй, магчыма, нават пачатковай апавядальнай формай.

«Дробніць жыццё на кроплі і вырывае лісткі з вялікай кнігі жыцця» (Бялінскі) — у такім значэнні, думаецца нам, вельмі трапна схоплена галоўная сутнасць апавядання.

Апавяданне лакалізуе факт, і ў гэтым, безумоўна, ёсць момант звужэння жыцця, але ў той жа час апавяданне не можа зусім перайначыць гэты факт, абысціся з ім вольна, бо факт — яго аснова. Вялікія формы на тое і «вялікія», што даюць магчымасць прадставіць адну і тую ж з'яву рознымі фактамі і пазбегнуць звужэння, убачыць скразную тэндэнцыю. Але ў рамане, бывае, можна і вальней абыходзіцца з фактам, перарабіць яго, захапіўшыся агульнай задумай, асабліва калі тэндэнцыі жыцця добра яшчэ не разведаны.

Вось чаму ў адны літаратурныя перыяды для даследавання сучаснасці найбольш прыдадуцца буйныя формы, у другія ж — малыя формы.

У чымсьці дапамагае лепш зразумець «сакрэт» навелістычнага жанру такая, напрыклад, з'ява дыялектыкі, як сфармуляваны для навуковых патрэб прынцып дадатковасці. Вось што піша аб гэтай, магчыма, адной са складанейшых з'яў пазнання фізік Макс Борн: «Нават у абмежаваных галінах апісанне ўсёй сістэмы ў адзінай карціне немагчыма. Існуюць дадатковыя вобразы, якія адначасова не могуць прымяняцца, але якія тым не менш адзін аднаму не супярэчаць і якія толькі сумесна вычэрпваюць цэлае. Гэта надзвычай плённае вучэнне, і пры правільным дастасаванні яно можа зрабіць заліцнімі шмат якія вострыя спрэчкі не толькі ў філасофіі, але ва ўсіх іншых галінах жыцця».

Уяўляецца, што гэтая універсальная з'ява вельмі добра характарызуе дыялектычную супярэчліва-шматгранную разнастайнасць жыцця, дзе суіснуюць, зжываюцца трагічнае з жыццесцвярджальным, камічнае з сур'ёзным, лёгкае са складаным, глыбокае з банальным і г. д. і да т. п.

Тут сапраўды не Эўклідава ардынарнае вымярэнне, а вялікая і аб'ёмная прастора Лабачэўскага з яе бязлітую плоскасцю, якія адна ў адну ўваходзяць, сутыкаюцца і размяжоўваюцца, дзе нават магчыма перасячэнне паралельных і дзе мала прыдатныя законы фармальнай логікі.

І думаецца, што прыроджаныя апавядальнікі — гэта людзі, у індывідуальнасці якіх вельмі моцна развіты менавіта гэты бок успрымання. Яны надзвычай востра адчуваюць неабходнасць розных падыходаў да жыцця, асабліва калі даводзіцца ўзнімаць жыццёвую цаліну.

Сапраўднае апавяданне і нараджаецца з іншай патрэбы, пры іншым падыходзе да жыцця, чым аповесць і раман. І вызначае гэту патрэбу час, у якім жыве пісьменнік.

Класічны ў гэтым сэнсе прыклад Чэхава. У сваіх пісьмах і выказваннях Чэхаў не аднойчы падкрэсліваў, што людзей яго пакалення старэйшага ўзнаўлавечыя рамантычныя ідэалы, якія асвятлялі XVIII і XIX стагоддзі, заяволіць ужо не маглі, што ў яго равеснікаў ідэалаў няма, што ў іх «ні бога, ні чорта за душою». Ім гэтыя ідэалы, аптымізм будучыні трэба было знайсці, выпрацаваць самім.

І якраз выбраны Чэхавым жанр саслужыў яму выдатную службу, бо вучыў цаніць вялікую складанасць жыцця, не даваў магчымасці дужа аддаляцца ад яго.

Але як жа Чэхаў перайначыў, перарадзіў жанр! Нездарма кажуць, што мы яшчэ і сёння жывём чэхаўскай рэформай прозы.

Чэхаў у свой час упершыню шукаў выйсця з «вузасці» апавядання і знайшоў яго ў прынцыпова новым фінале, які шырока «размыкае» твор у жыццё.

Герой Чэхава неяк асабліва сур'ёзна задумваецца на перавале перажытага, узбагачаны новым вопытам перад новымі жыццёвымі далямі.

Чэхаў, па сутнасці, пераступіў у апавяданні рамкі лакальнага, пераадолеў аўмоўленую самой прыродай малога жанру звужанасць жыццёвага матэрыялу. Не выпадкова экранізацыя чэхаўскіх апавяданняў разгортваецца ў буйнаметражныя карціны.

За ўвагу працягнуў гісторыю жанр апавядання пасля ў развіць многія разнастайныя формы. Ранні апавяданне, відаць, імкнулася больш за ўсё да навелы з яе вастрынёй сюжэтнай будовы, выразна акрэсленай кампазіцыяй, арыгінальнасцю і рэдкасцю выпадку, пакладзенага ў аснову твора. Відаць, В. Буран у сваім жаданні звесці ўсю складаную разнастайнасць сённяшняга апавядання да строгіх норм і выхадзіў з навелы. Аднак зводзіць усю сённяшнюю разнастайнасць апавядання толькі да навелы было б недарэчна. Мне, напрыклад, вельмі падабаецца своеасаблівы антыпод навелы — апавяданне, напісанае ў форме, блізкай да нарысавай. У ім жанравыя рамкі не гэтак устойлівыя, дзея ўзнікае як бы з нічога, з бытавых рэалій. Пры пэўных стратах у строгасці формы ў іх свая перавага — даверлівасць тону, рэалістычнасць, вельмі моцна выяўлены момант даследавання. Своеасаблівая, у чымсьці нарысавая манера, блізкая традыцыям тургенеўскіх «паляўнічых» апавяданняў, выбрана І. Чыгрынавым у творах «Адна ноч», «Шукаючы скарбы», «Вадалазы Сухавы, Віцька Каргыжоў і нафтаправод» і інш.

Падтрымаць крытыка можна толькі ў тым, што сённяшняя сапраўдная навела сустракаецца даволі рэдка і што нашым апавядальнікам не шкодзіла б звяртацца час ад часу да гэтай строгай формы нават для кантролю, ці не «расхісталася» пяро, ці не забыліся апавядальныя навыкі...

У літаратуры вельмі важна гэтая неаднолькавасць падыходу, тое, з якім сэрцам, з якім настроем душы ўспрымаеш падзеі. І мне здаюцца крыху залішнімі сімпаты В. Бурана толькі да «сур'ёзных» форм. Здараюцца ў жыцці лятучыя імгненні настрою, цікавых выпадкаў, сустрэч з прыгожым, з радасцю, што патрабуе эцюда, рамантычнага апавядання, лёгкай журботнай элегіі. «Асколачак вясёлкі» Я. Брыля не дае, скажам, шырокіх абагульненняў. Але там ёсць прамяністае ззянне дзіўнай радасці жыцця, вясёлае адчуванне прыгажосці чалавечага маленства...

НЕ ПАДЗЯЛЯЮЧЫ ўвогуле даволі крытычную ацэнку сённяшняга стану беларускага апавядання, мы, аднак, не можам не згадзіцца з В. Бураном у тым, што ў каго-нікаго з празаікаў неяк аслаб пісьменніцкі зрок на супярэчлівыя, нявырашаныя ў жыцці праблемы.

Праўда, усё гэта датычыцца не толькі апавядання, а літаратуры наогул, і ў большай ступені яе буйных жанраў. Пісьменнікі быццам бы заняты падрыхтоўчай працай, быццам бы засяроджаны на другарадным, падбіраюць пакуль што пабочныя тэмы, увесь час маючы на ўвазе, — прынамсі, так хочацца думаць — сур'ёзнае, глыбокае, праблемнае — галоўнае слова аб нашым часе.

І сёння, думаецца мне, значны цяжар у літаратурным працэсе перамяшчаўся на апавяданне...

ПЯСНЯР ЛАТВІІ

Гэты здымак зроблены ў верасні 1959 года, у часе Тыдня латышскай літаратуры ў Беларусі. На ім занатавана сустрэча даўніх і добрых сяброў — Пімена Панчанкі, Яна Судрабкалн і Максім Танк. Фота Ул. КРУКА.

Ян Судрабкалн...

Гэтае імя акружана ў Савецкай Латвіі ўсеагульнай любоўю і пашанай. Такое ж усеагульнае прызнанне знайшла ў сэрцах латышоў і яго яркая, самабытная паэзія. І не толькі ў сэрцах латышоў — ва ўсіх братніх савецкіх рэспубліках ведаюць, любяць і чытаюць кнігі выдатнага латышскага паэта.

Беларускія літаратары і чытачы ведаюць Яна Судрабкална не толькі як вялікага майстра савецкай паэзіі, але і як дайняга і добрага друга беларускай літаратуры, нястомнага перакладчыка і прапагандыста яе лепшых набыткаў у братняй Латвіі.

Зайтра народнаму паэту Латвійскай ССР спаўняецца 75 гадоў. Беларускія пісьменнікі, яго сябры і чытачы на Беларусі шлюць Арвіду Карлавічу самыя шчырыя віншаванні са слаўным юбілеем і найлепшыя пажаданні — здароўя, бадзёрасці, доўгіх гадоў жыцця і новых творчых здзяйсненняў.

Змяшчаем некалькі вершаў Яна Судрабкална ў перакладзе на беларускую мову.

Ян СУДРАБКАЛН

ЗАЛАЦІСТЫЯ КЛЯНОВЫЯ ЛІСТЫ

Жоўтае лісце падае, падае з клёнаў
На плечы джэнтльменаў і
банкаўскіх клеркаў,
Проста ім на галовы ляціць.
Банкаўскі служка дрыжыць аж да
самае скуры падэшваў:
Вільготны і жоўты, шурпаты
агромністы ліст!
Так неспадзеўна, ніхто і прыкмеціць
не здолеў,
Як буйнае лісце пажоўкла і кружыцца
з ветрам,
А ўчора яшчэ зелянела, трымалася
пругкай галінкі,
І раптам пажоўкла і падае, падае.
Нават ніжэй за сусветнай валюты,
У лужы, на брудныя рэйкі і на галовы
прыстойных людзей.
Хларафіл—жывацворная фарба
друкарань кляновых
Застые у ствалах і ў карэннях
ужо не пульсуе,
Вецер з клёнаў пажоўклых даўгі
вытрасае,
Клён-даўжнік у адчаі разводзіць
рукамі —
Поўны крах і падзенне кляновай
валюты.

■ ■ ■

Кляновае лісце кружыцца, падае
і ляціць.
За кастрычніцкай брамай лістапад
і скуголіць і крэкча,
Дыфтэрыт у ягоным прастуджаным
горле храпе,
І рыпіць рэўматызм, як старая
падэшва.
Толькі жоўта-барвовы апошні лісток
На застылай галінцы трапеча,
Гаспадар не жадае запальваць
у печы:
Божа, злітуйся! Лета ж яшчэ
на дварэ.
Гэта існасць мая расшчапілася напал
Супрацьлеглых жаданняў і дум:
Паэтычнасць душы патрабуе і прагне
Самых смелых высокіх узлётаў,
Хоць чытае Уолеса, рэжацца ў карты,
Нават з Эгертам фільмы заўсёды
глядзіць.
А душа ў рамантычным узнёсным
палёце:
Ах, не падай, асенняе жоўтае лісце,
Залаціста-румянае, як жаўток,
як густы кармазын.
А істота, што ведае толькі
бальнічную касу
І цану на сукно, так плюе
у калюжыны звонка,
Што наўкол адгукаецца громам:
Асыпайцеся, падайце, згіньце,
датлейце навек!

■ ■ ■

Жоўтыя кляновыя лісты
Ападаюць, кружацца, лятаюць.
Так надзеі з марамі жаўцеюць
І знікаюць і ўшчэнт датлеюць,
Як глыбокай восенню лісты.
Вось ідзеш адзін дажджлівай ноччу
І чутно, як паміж голля лісце
Падае і хлюпае у лужах,
І відно, як адліваюць срэбрам
У асенням цёмным небе зоры
І ляцяць з вышыняў у бяздонне:
Ападаюць зоры — неба светлыя
лісткі.

ЖЫВАЯ МОВА

Жывую латышскую мову
Далёка на захадзе, ў сне,
Я слухаў, як зачараваны,
І сон перарваць не пасмеў.

Свісталі ў прысадах сініцы,
Крышыла ільды Даўгава,
Пярун грукатаў у нябёсах,
І маці люляла дзіця.

Спяваў пастушок свае дайны,
І Райніса слова гучала.
Я раптам у сне скаламуўся —
Мне сціснула шыю змяя,

Бо дзякаваў хтосьці фашысту,
Бо хтосьці назваў яго другам.
І я прахапіўся ад жаху —
Кашмар! Адступіся, кашмар!

Хто нашай ласкаваю мовай
Так дзякуе вылюдку-немцу,
Той словам, як тручаным джалам,
Мне сэрца пячэ навылёт.

І нават сабакі ад страху
Знікаюць за шчыльным парканам,
Я ж слухаю енкі і стогны
На захадзе сірат і ўдоў.

Там мала глухіх баязліўцаў,
Там воіны дужыя клічуць
Змагацца за шчасце і праўду
Сумленных усіх латышоў.

У вольнага толькі народа
Ёсць мова жывая заўсёды.

БЛІСКУЧЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Дагэтуль раны даўнія смыліць
і спатыкаецца бязногі,
Мільёны прагна просяць дапамогі,
Салдат забыты ўжо з прабітай
галавой,
Акопы зараслі ядлоўцам і травой,
Гароды аплялі даўно калючым
дротам,
Сваё, уласнае — за непрыступным
плотам.
І ўсюды межы, дрот, штыкі і рубяжы,
Законам дужага зноў, чалавек,
служы.
На светлай праўды дух ашчэрылі
зацята
Клыкі самаўпэўненасць, мана,
дзікунства, здрада.
Зірні наўкол: цвіце даспелы луг,
Але слязою й сэрцах мы не знаем,
друг.

■ ■ ■

Правы на шчасце кожнага народа
Праслаўлены даўно, ды толькі
не заўсёды
Свабодай кожны ўмее даражыць:
Імкнецца хтосьці дротам абкружыць
Сваю зямлю, паставіць мытні, варту
І пагражаць суседзям не на жарты.
Свет хутка стане найвялікшым домам,
Дзе дзверы у пакой зламаць
спрабуюць ломам:
У Данії Ісландыю адрэзаць,
У Латвіі Латгалію адняць —
Пра гэта армії і прэзідэнты сняць.
Брыану, калі толькі дажыве,
адправім эцтрэгламу:
Цалуем Пан-Еўропу, як ветраную
даму.

■ ■ ■

Доктар хіміі з Гейдэльберга,
З Кембрыджа, з Калумбійскага
універсітэта,
Што ў рэтортах твaіх!
Паратунак, ці гібель для цэлага
свету!
Ты збяры смертаносна-салодкія
газы
У чысты сеўрскі фарфор,
ў арэфорскія тонкія вазы
І схавай, як нектар ці гаючы
амброзій,
Каб забыліся ўсе аб страшэннай
пякельнай пагрозе,
Каб ад захаду людзі да ўсходу
Ад нянавісці вызваліліся назаўсёды.

Пераклад С. ГРАХОЎСКАГА.

У ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ Г. П. ГЛЕБАВУ

Глядзельная зала Дома мастацтваў перапоўнена. Сюды прыйшлі ветэраны і творчая моладзь тэатра імя Янкі Купалы, работнікі мастацтва Мінска, рабочыя, студэнты. Прыйшлі, каб ушанаваць светлую памяць народнага артыста СССР Глеба Паўлавіча Глебава.

Вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння гэтага выдатнага майстра беларускай сцэны, адкрыў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Стэльмах. Ён гаварыў пра вялікі творчы ўклад, які ўнёс у беларускае мастацтва Глебаў — непаўторна-арыгінальны і таленавіты акцёр, незвычайна сціплы і чулы чалавек.

Хвалюючым было выступленне народнай артысткі БССР В. Галіны - Александроўскай, якая многа гадоў працавала разам з Глебам Паўлавічам.

— Да нас у тэатр прыйшоў непрыкметны, надзвычай сціплы чалавек,— расказала Вольга Уладзіміраўна.—Гэта быў Глебаў. На першым часе яго займалі ў масавых сцэнах. Але хутка ён звярнуў на сябе ўвагу і таварышаў па сцэне і гледачоў. Мне асабліва запомніўся ён у такой складанай ролі, як Павел Нямira ў спектаклі «Бацькаўшчына» К. Чорнага, у якім Глеб Паўлавіч выявіў свой незвычайны тэмперамент і ўсхваляванасць. Як чытаў ён знакаміты маналог аб зямлі! Я і цяпер чую непаўторныя інтанацыі яго голасу.

Ветэран купалаўскага тэатра народны артыст СССР Л. Рахленка тэксама падзяліўся сумеснымі аб шматгадовай сумеснай творчай рабоце з Глебам Паўлавічам Глебавым.

— Я заўсёды любіў іграць з ім, — гаворыць Леанід Рыгоравіч. — Ён быў надзвычай тонкім і мудрым партнёрам. Быць побач з ім на сцэне было сапраўднай творчай асалодай. Больш 600 разоў мы ігралі з ім камедыю К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Ён — Туляга, я — Гарлахвацкі. І амаль у кожны спектакль Глеб Паўлавіч уносіў нейкі ледзь улоўны, толькі нам зразумелы, новы нюанс. Я імкнуўся адказваць яму тым самым. І гэтыя маленькія нашы знаходкі, узаемныя сюрпрызы грэлі душу.

На вечары з успамінамі таксама выступілі заслужаны артыст рэспублікі Раман Філіпаў і кінарэжысёр Сяргей Сплашноў. У заключэнне быў паказан дакументальны фільм пра Глебава «Народны артыст». Удзельнікі вечара пазнаёміліся з выставкай фотаработ, якія захоўваюць найбагацейшую калекцыю вобразаў, створаных вялікім акцёрам.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

НОВЫЯ НАЗВЫ — НА АФІШАХ



Адбылася прэм'ера спектакля «Узрост расплаты» па п'есе Л. Жукавіцкага ў Дзяржаўным рускім тэатры БССР імя М. Горкага. Рэжысёр спектакля Ф. Шэйн, мастацкае афармленне В. Галубовіча

На першым здымку — сцэна са спектакля. У ролі Ягора Каралёва — артыст І. Камароў (злева), Аляксея Фядотавіча — заслужаны артыст БССР К. Верамейчык.

Гродзенскі абласны драматычны тэатр паставіў спектакль па п'есе В. Лаўрэнцьева «Чалавек і глобус». Геаічная хроніка расказвае пра работу савецкіх вучоных-фізікаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Пастаноўшчык спектакля А. Струнін.

На здымку ў цэнтры — фінальная сцэна спектакля. У ролі вучонага Георгія Барміна — артыст А. Крэстнікаў (справа), Лявона Максімавіча — артыст В. Шмакаў.

У рэспубліканскім тэатры юнага гледача адбылася прэм'ера спектакля «Аграбленне апоўначы». Рэжысёр — дыпломніца Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Л. Тарасава, мастак Р. Тарасаў, музыка С. Картэса. На здымку вы бачыце артыстаў М. Пятрова ў ролі Кара і Б. Піскуна ў ролі намесніка дырэктара.

Фота Ул. КРУКА, Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА) і А. КАЛЯДЫ.

Культурнае жыццё за рубяжом

ГОД РЭМБРАНТА

Сёлетні год афіцыйна аб'яўлены ў Нідэрландах «годам Рэмбранта». Творчасцю вялікага галандскага мастака і цяпер — праз 300 гадоў пасля яго смерці — захапляецца ўвесь свет.

Нядаўна ў Амстэрдаме адбылася прэс-канферэнцыя віднага галандскага вучонага-мастацтвазнаўцы Вана Схендэла, на якой ён расказаў аб тым, як у Галандыі будзе адзначана 300-годдзе з дня смерці Рэмбранта.

Самым значным мерапрыемствам, якое арганізоўваецца ў рамках «рэмбрантаўскага года», будзе несумненна унікальная па сваім маштабе выстаўка яго палотнаў, якую вырашана правесці ў Амстэрдаме ў верасні. Наведвальнікі выстаўкі не толькі ўбачаць 50 карцін Рэмбранта, якія захоўваюцца ў розных галандскіх музеях і прыватных калекцыях. Яны ўбачаць таксама 9 славутых твораў мастака з іншых краін свету. Многія з гэтых палотнаў не вывозіліся за межы тых краін, дзе яны знаходзяцца. Але зараз, у юбілейным годзе, палотны Рэмбранта зробяць першае падарожжа на сваю радзіму. Побач з вялікімі творамі на юбілейнай выстаўцы ў Амстэрдаме будзе экспанавацца таксама 120 лепшых малюнкаў Рэмбранта.

Вялікую цікавасць выклікае і маючы адбыцца ў Амстэрдаме міжнародны сімпозіум, прысвечаны творчасці Рэмбранта. Удзельнікі сімпозіума ўдзеляць асаблівую ўвагу такой важнай праблеме, як арыгінальнасць раду твораў, якія, як лічыцца, належаць Рэмбранту. У чым сутнасць гэтай праблемы?

Агульнапрызнана, што самая капітальная праца аб творчасці Рэмбранта напісана вядомым галандскім вучоным А. Брэдзіусам. У гэтай манументальнай кнізе, выдадзенай у 1938 годзе, зафіксіравана 630 карцін славутага майстра. Але ці ўсе яны сапраўды належаць пэндзлю Рэмбранта? Бо ў эпоху, калі жыў і творыў мастак, не заўсёды было прынята падпісваць карціны. Таму многія палотны, якія, як лічыцца, напісаны Рэмбрантам, не маюць подпісу. Многія вучні Рэмбранта нярэдка стараліся пісаць у той жа манеры, што і іх геніяльны настаўнік. Нярэдка Рэмбрант дапамагаў сваім вучням або дазваляў ім заканчваць адну са сваіх карцін. Бывала і так, што безымянныя таленты рабілі надзвычай удалыя копіі з палотнаў Рэмбранта.

— Некаторыя мастацтвазнаўцы выказваюць сумненні ў адносінах прыкладна 10 працэнтаў усіх вядомых нам палотнаў Рэмбранта, — заявіў Ван Схендэл карэспандэнту ТАСС. — Магчыма, што гэты працэнт некалькі завышаны, але так ці інакш стараннае навуковае даследаванне творчасці Рэмбранта, у ходзе якога шырока прымяняюцца рэнтгеназдымкі і іншыя сучасныя метады, дазваляе час ад часу ўносіць істотныя папраўкі ў каталог, складзены Брэдзіусам. Доўгі час лічылася, напрыклад, што карціна «Пакланенне вешчуноў», якая захоўваецца ў Ленінградскім Эрмітажы, — гэта копія, а арыгінал знаходзіцца ў музеі горада Гетэборга. Савецкія вучоныя, неабвержна даказалі, што ўсё якраз наадварот.

Трэба спадзявацца, што шырокі абмен вопытам на навуковым сімпозіуме ў Амстэрдаме дазволіць ліквідаваць «белыя плямы», якія яшчэ ёсць у вывучэнні творчасці Рэмбранта.

Ю. КАРНІЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

АД КАМІТЭТА ПА ЛЕНІНСКІХ І ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ СССР

Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР прымае работы на атрыманне Дзяржаўных прэмій СССР 1970 года.

Прымаюцца творы літаратуры і мастацтва, архітэктурныя збудаванні, апублікаваныя (узведзеныя) не пазней 15 чэрвеня 1969 года. Работы прымаюцца да 15 снежня 1969 года.

Камітэт працягвае да 16 кастрычніка г. г. прыём кандыдатур на атрыманне Ленінскіх прэмій 1970 года. У тым жа тэрміны камітэт прымае работы на атрыманне нанова ўстаноўленых адной Ленінскай і адной Дзяржаўнай прэмій СССР за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей.

Адначасовае вылучэнне адной і той жа работы на Ленінскую і Дзяржаўную прэмію СССР не дапускаецца.

Па ўсіх пытаннях, звязаных з умовамі вылучэння і афармленнем дакументаў, звяртацца ў Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры па адрасу: Масква, Цэнтр., ГСП-2, Нягліная вул., 15, тэл. 223-44-67, 223-19-30.

МЭТА КОНКУРСУ — ПАДРУЧНІКІ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Міністэрства асветы рэспублікі і Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку аб'яўляюць адкрыты конкурс на лепшыя новыя падручнікі па беларускай літаратуры для 8 класа (дакастрычніцкая літаратура) і для 9—10 класаў (савецкая літаратура). Мэта конкурсу — стварэнне стабільных падручнікаў, якія б адпавядалі сучасным праграмным патрабаванням, адлюстроўвалі дасягненні літаратуразнаўства і педагагічнай навукі ў справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

Конкурс праводзіцца з 20 мая 1969 года па 20 мая 1971 года. У ім могуць прыняць удзел як асобныя аўтары, так і аўтарскія калектывы.

Прадстаўленыя на конкурс падручнікі павінны вызначацца высокім ідэйна-тэарэтычным узроўнем, дасканаласцю ў выкладанні матэрыялу. Сваім зместам і метадычнай пабудовай падручнікі павінны садзейнічаць ідэйна-палітычнаму і эстэтычнаму выхаванню вучняў, укараненню перадавых метадаў навучання, стварэнню ўмоў для развіцця пазнавальных здольнасцей вучняў.

Аб'ём падручніка для 8 класа павінен быць 12 друкаваных аркушаў, для 9—10 класаў — 20 друкаваных аркушаў.

Рукапісы прымаюцца на працягу ўсяго тэрміну конкурсу да 20 мая 1971 года ўключна. Адначасова з рукапісам (у двух экземплярах, надрукаваных на машынцы праз два інтэрвалы на лістах стандартнага памеру) аўтар альбо члены аўтарскага калектыву ў закрытым канверце паведамляюць аб сабе наступныя звесткі: імя, імя па бацьку, прозвішча, прафесію, месца работы, пасаду, вучоную ступень або званне, хатні адрас.

Рукапісы дасылаюцца на адрас: Мінск, Дом урада, Міністэрства асветы БССР, Упраўленне школ. На конкурс.

Прадстаўленыя на конкурс рукапісы разглядаюцца журы, у склад якога ўваходзяць навуковыя работнікі, метадысты, пісьменнікі, настаўнікі-практыкі.

За лепшыя падручнікі прысуджаюцца наступныя прэміі: дзве першыя — па 2 000 рублёў кожная, дзве другія — па 1 500 рублёў кожная і дзве трэція — па 1 000 рублёў кожная.

Вынікі конкурсу зацвярджаюцца калегіяй Міністэрства асветы БССР і публікуюцца ў перыядычным друку. З аўтарам альбо аўтарскім калектывам лепшых рукапісаў выдавецтва «Народная асвета» заключае дагавор на выданне іх у якасці стабільных падручнікаў для агульнаадукацыйнай школы.

НАРАЎЛЯНСКІЯ КНІГАЛЮБЫ

Яны толькі ў нараўлянскую кнігарню паступае новая партыя літаратуры, яе загадчыца Яўгенія Піліпаўна Кавальчук і прадавец Рыгор Іларыёнавіч Кавальчук адразу паведамляюць аб гэтым у бібліятэкі раёна, ва ўстановы, на прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы. Яны звоняць па тэлефоне, шлюць пісьмы і паштоўкі.

Вядома, новая літаратура прыбывае не кожны дзень, але калі б ні зайшоў у кнігарню, тут заўсёды людна. Часта можна сустрэць у магазіне выкладчыцу дзіцячай музычнай школы Святлану Бялько, работніцу камбіната бытавога абслугоўвання Ніну Бастун, пенсіянера Адама Дубоўскага і іншых кнігалюбаў. Яны купляюць навінкі не толькі для сваіх бібліятэк, але і памагаюць бібліятэкарам прадпрыемстваў, устаноў, школ.

У магазіне каля двухсот пастаянных падпісчыкаў. Сярод іх — урач Дзіна Чочуева, настаўнікі Франц Будкоўскі, Уладзімір Белаглавак і іншыя. Кніжны магазін мае пастаянных падпісчыкаў не толькі ў Нароўлі. З кнігарні атрымліваюць літаратуру жыхары Гомеля, Мінска, Кішынёва, Львова.

Пры магазіне працуюць шмат кніганош. Гэта людзі розных узростаў і прафесій. Некалькі гадоў актыўна распаўсюджваюць літаратуру работніца раённага Дома культуры Раіса Лібман, пінерважатыя Браніслава Кравец і Людміла Нодэльман, бібліятэкар Кіраўскай сярэдняй школы Люба Валасюк.

Яўгенія Піліпаўна і Рыгор Іларыёнавіч працуюць другі год. Але ў прапагандзе літаратуры дабіліся ўжо немалых поспехаў.

Я. РОМБАК.

ПАСЛЯ РЭСТАЎРАЦЫІ



Нядаўна поўнасцю закончана рэстаўрацыя палаца Паскевіча ў Гомельскім парку культуры і адпачынку імя А. Луначарскага.

На здымку — сучасны выгляд вежы палаца.

Фота С. ФАРБЕРАВА.

СЕЗОН 1968-69

УВЕСЬ КЛАВІРНЫ БАХ

Дзве «Французскія сюіты», «Італьянскі канцэрт» і шэсць апошніх прэлюдый і фуг з другога тома «Добра тэмперыраванага клавіра» — такая была праграма заключнага канцэрта заслужанай артысткі РСФСР лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, прафесара Маскоўскай кансерваторыі Таццяны Нікалаевай. Увесь цыкл з шасці канцэртаў, дадзеных піяністкай у канцэртнай зале Беларускай філармоніі, быў прысвечаны творчасці Іагана Себасьяна Баха і ахапіў асноўныя клавірныя творы вялікага нямецкага кампазітара: усе 48 прэлюдый і фуг двух тамоў «Добра тэмперыраванага клавіра» і такія капітальныя і маштабныя творы, як «Мастацтва фугі», «Капрычыо на ад'езд любімага брата», «Храматычная фантазія і фуга», «Гольдбергаўскія варыяцыі». Калі дадаць да гэтага нямала твораў у жанрах сюіты, партыты, канцэрта і такаты, таксама шырока прадстаўленых у праграмах Т. Нікалаевай, дык стане зразумелым, які творчы подзвіг здзейсніла таленавітая піяністка.

Цікавасць мінчан да канцэртаў маскоўскай госці была вельмі вялікая. Да таго ж яшчэ большасць выкананых твораў Баха да гэтага часу не фігурявала на афішах нашых канцэртаў і з'явілася для мінскіх аматараў музыкі «старадаўнімі навінкамі». Паказальна, што сярод тых, хто ахвотна наведваў канцэрты бахаўскага цыкла, было многа моладзі з музычных навучальных устаноў Мінска і многа музыкантаў-педагогаў. Для іх выступленні прафесара Маскоўскай кансерваторыі былі, апрача ўсяго іншага, добрай піяністычнай школай, «адкрытымі ўрокамі», на тэму: як іграць клавірнага Баха.

Прыцягнула ўвагу, натуральна, і сама Таццяна Нікалаева — адзін з лепшых інтэрпрэтатараў музыкі Баха, яркая прадстаўніца савецкай выканаўчай школы.

Здзіўляе фенаменальная памяць піяністкі. Калі ўспомніць, што ў яе рэпертуары не толькі ўвесь клавірны Бах, але і ўсе санаты Бетховена, усе прэлюдыі і фугі Шастаковіча, мноства твораў Шапэна і Брамса, Чайкоўскага і Рахманінава, Мяскоўскага і Пракоф'ева і многіх іншых кампазітараў, дык з'яўляецца пачуццё шчырай павагі да той велізарнай працы, якую ўклала Т. Нікалаева ў падрыхтоўку сваіх канцэртных праграм.

Аднак не гэта галоўнае. Вельмі прывабнае само артыстычнае аблічча піяністкі, чыё ўпэўненае і адточанае майстэрства робіць надзвычай моцнае ўражанне. Слухаць Нікалаеву, нават калі яна іграе тэхнічна цяжкія творы, лёгка і неяк асабліва прыемна: бо ўся вялікая папярэдняя праца артысткі застаецца па-за эстрадай, а слухачу прапануецца толькі тое, што набыло закончаную і дасканалую выканаўчую форму. Адсюль — адчуванне дакладнасці і лёгкасці, прастаты і натуральнасці музыцыравання.

Інтэрпрэтацыя Нікалаевай твораў Баха вызначаецца вялікай глыбінёй і філасофскай мудрасцю. Пад пальцамі піяністкі Бах гучыць па-сучаснаму, з багатай градацыяй самых розных, часам узвышаных і сур'ёзных, часам простых і наіўных, але заўсёды высакародных чалавечых пачуццяў. Прычым піяністка настолькі пагружаецца ў стыхію бахаўскай музыкі, што пачынае здавацца, быццам у яе музычным свеце толькі Бах і існуе. Але не! Вельмі павучальна было назіраць, як Таццяна Нікалаева іграе «на біс» творы іншых кампазітараў. У адным з канцэртаў, напрыклад, гэта былі два творы Бетховена — скерца з 18-й санаты і багатэль «Элізе», — і піяністка адразу перанесла слухачоў у іншы свет музычных адчуванняў, нібы гаворачы: «Я не толькі «бахістка»; вось мой Бетховен!» Гэта быў цудоўны Бетховен: заўзяты і жыццярадасны ў скерца і вельмі пяшчотны, няўпэўнена-чысты ў багатэлі. Стала зразумела: піяністцы падуладна многае.

Цыклы канцэртаў, прысвечаных адной тэме, займаюць у канцэртнай практыцы Т. Нікалаевай значнае месца і сведчаць пра яе цягу да свайго роду «музычнага макраскопу»: выкананне не асобны твор і не асобная закончаная праграма «аднаго вечара фартэпіяннай музыкі», а цэласны пласт твораў, якія ўяўляюць сабой значную з'яву ў сусветнай музычнай культуры. Такія цыклы заўсёды ўяўлялі для слухача вышэйшую цікавасць, а для выканаўцы — вышэйшую цяжкасць і былі даступныя толькі буйным артыстам. У свой час выдатнай падзеяй былі «гістарычныя канцэрты» Антона Рубінштэйна. У 30-я гады з такімі цыкламі выступаў піяніст С. Фейнберг. Памятнай з'явай музычнага жыцця сталі выступленні М. Растраповіча (цыкл віяланчэльных канцэртаў) і Д. Ойстраха (цыкл скрыпічных канцэртаў). Т. Нікалаева паспяхова і дастойна практыкуе гэты від канцэртнай дзейнасці.

Развіваючыся з Таццянай Нікалаевай, мы папрасілі яе адказаць на некалькі пытанняў.

— Ці задаволены вы, Таццяна Пятроўна, тым, як прайшоў ваш бахаўскі цыкл?

— Вельмі задаволена. Скажу больш: я шчаслівая, што змагла правесці яго ў Мінску. Не ўсякай філармоніі гэта пад сілу.

— Ці не дасцё вы ў Мінску да 200-годдзя з дня нараджэння Бетховена ваш бетховенскі цыкл?

— Я ўжо атрымала такое запрашэнне ад кіраўніцтва Беларускай дзяржаўнай філармоніі і ахвотна яго прыняла. У васьмі канцэртах я сыграю ўсе 32 фартэпіянныя санаты Бетховена.

— Ці запланаваны ў вас у бліжэйшы час зарубежныя паездкі?

— Неўзабаве адбудзецца ў Вене фартэпіянны конкурс імя Бетховена. У ім упершыню прымуць удзел савецкія піяністы, а я запрошана быць членам журы конкурсу. Увосень я буду ўдзельнічаць у Боне у міжнародным музычным семінары, дзе прачытаю даклад аб «Мастацтве фугі» Баха і, натуральна, сыграю гэты твор. Потым адбудуцца мае канцэртныя выступленні ў радзе гарадоў ФРГ. У Генуі (Італія) я выканаю з тамашнім сімфанічным аркестрам Пяты фартэпіянны канцэрт Пракоф'ева...

Т. Нікалаева не толькі таленавітая піяністка, але і таленавіты кампазітар, аўтар раду фартэпіянных, камерна-інструментальных і сімфанічных твораў. За свой фартэпіянны канцэрт яна была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР. Таму наша апошняе пытанне было такое:

— Над чым вы працавалі ў апошні час як кампазітар?

— Не так даўно я закончыла Другі фартэпіянны канцэрт. У Маскве ён ужо выконваўся, спадзяюся сыграць яго і ў Мінску.

Мінскія аматары музыкі будуць з нецярпеннем чакаць новых творчых сустрэч з піяністкай і кампазітарам Таццянай Нікалаевай.

Леў АЎЭРБАХ.

РАСТОЎ ВЯЛІКІ ЗАПРАШАЕ...

У РАСТОВЕ-ЯРАСЛАЎСКІМ АДКРЫЎСЯ МІЖНАРОДНЫ МАЛАДЗЕЖНЫ ЦЭНТР

МНЕ СКАЗАЛІ: «Заўтра адкрываецца «Растоў Вялікі». Амаль два гады я чакаў гэтай весткі. У канцы мая 1967 года газета «Известия» надрукавала маю карэспандэнцыю «Горад на возеры Нера», у якой я «неабдумана» паведаміў чытачам аб тым, што ў адным з самых унікальных помнікаў старажытнага рускага дойлідства — Растоўскім Крамлі ствараецца Міжнародны турысцкі маладзёжны лагер. Хлыну паток пісьмаў чытачоў — толькі паспявай адказваць. «Калі адкрыецца маладзёжны турысцкі лагер, дзе набыць пуцёўку?» Гатыя пытанні былі некалькі дачасныя. Трэба было яшчэ многае зрабіць рэстаўратарам і будаўнікам.

Савецкія рэстаўратары паставілі перад сабой цяжкую задачу: узнавіць Крэмль у першапачатковым выглядзе, якім яго задумаў і пабудаваў у XVII стагоддзі сын вясковага папа, апальны месцаахоўнік маскоўскага патрыяршага прэстола Іона Сысоевіч. Многа гадоў працягвалася нястомная і карпатлівая праца рэстаўратараў на чале з архітэктарам Уладзімірам Баніге, якія вярнулі Крамлю былую прыгажосць. Работы яшчэ не завершаны. Усяго толькі некалькі дзён назад цалкам закончана аднаўленне і абсталяванне двухнавярхового будынка царскага пуцівога палаца — Чырвонай палаты, у якой, паводле падання, спыняўся Пётр І і іншыя імянітыя госці мітраналіцкага дома. Аднаўленне царскіх церамаў ажыццяўлялася па ініцыятыве ЦК ВЛКСМ, Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік» і пры ўдзеле студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Таму і вырашана арганізаваць у Чырвонай палаце Міжнародны маладзёжны цэнтр «Растоў Вялікі».

Аб адкрыцці цэнтра мне паведамілі нанач ад ні, і я вырашыў не чакаць, калі напіцяць туды першыя госці і кіраўнікам цэнтра будзе «не да карэспандэнтаў», тут жа паехаў з Яраслаўля ў Растоў.

Вельмі многа разоў ездзіў я па гэтай дарозе ва ўсе поры года і кожны раз быццам ехаў упершыню, адкрываючы новыя прыгажосці ў спаконвечных рускіх пейзажах. Аляксею Талстому ўжо на схіле гадоў аднойчы давялося праехаць па Маскоўскай дарозе да Яраслаўля і ён выказаў шкадаванне, што не ведаў раней аб прыгажосці тутэйшых месц, а то б абавязкова пасяліўся ў гэтым някрасаўскім краі...

Дарога ад Яраслаўля да Растова — як адно імгненне, і вы ўжо праязджаеце новенькія чатырохнавярховыя жылыя дамы, чырвоныя карпусы льнопрадзільнай фабрыкі «Рольма», кофе-цыкорны камбінат, гарадскі сад і прама ўязджаеце ў Вадзяныя вароты Растоўскага Крамля. Крапасныя сцены, байніцы, цясовыя шатры, лемяховы ўзор на вежах і церамах, мноства рознакаляровых купалаў цэркваў, дымнікі, пазалочаныя прапары і крыжы, тысячапудовыя званы славутай растоўскай званіцы здзіўляюць уражліваго навічка сваімі памерамі, непрыступнай веліччу, аздабленнем. Не дапамагае нават выратавальная ў падобных выпадках іронія: «А нашы продкі, аказваецца, сёе-тое маглі рабіць!» Праходзіць час, і навічок набывае новы незвычайны стан: шкоднае імкненне аблазіць усе цэрквы, прабегчы па крытых пераходах крапасных сцен, узабрацца на Вадзяную вежу, спусціцца ў падклеці і заглянуць ва ўсе месцы, куды служыцелі музея звычайна не пускаюць турыстаў. Час для аналізу ўражанняў і асэнсавання ўбачанага прыйдзе пазней, можа, ужо тады, калі вы будзеце ідмчацца ў экспрэсаўтобусе або электрычцы да сябе дамоў. З'явіцца думкі аб сувязі стагоддзяў і пакаленняў, вытокаў нацыянальнай культуры і характару, пацягне да паэм Пушкіна і палотнаў Мікалая Рэрыха, абновіцца пачуццё прыналежнасці да гэтай зямлі, пачуццё Радзімы.

...На Мітраналіцкім дварэ грымеў рэпрадуктар. Аркестр рамкоўых інструментаў выконваў вясёлую танцавальную мелодыю. І, можа, таму Чырвоная палата з яе высокім парадным ганкам, нягледзячы на дажджлівае надвор'е, выглядала весела і святочна. Збегла з ганка купка дзяўчат у рускім нацыянальным адзенні і наймчалася праз двор у Самуілаў корпус. Я накіраваўся ўслед. Тут размясціўся штаб маладзёжнага цэнтра. Намеснік дырэктара цэнтра Уладзімір Суворай расказаў мне аб маючай адбыцца сустрэчы першых гасцей «Растова Вялікага». Ах сустрэнуць хлебам-соллю Яраслаўна і Яраславіч, былінныя волаты Ілья Мурамец, Дабрыня Нікіціч і ўраджэнец Растова Вялікага Алёша Паповіч. Падрыхтавана ўжо і прывітальная прамова Яраслаўны: «Ох вы гой еси добры молодцы, добры молодцы да красны девицы!..» Абласканых гасцей правядуць у светлыя пакоі, а потым пасадзяць у скляпенчатай трапезнай за дубовы стол на лаўкі, абцягнутыя каляровым сукном. Усё, усё: адзенне гаспадароў, посуд, свяцільнікі (панікадзілы), стравы будуць такія, як на старажытнай Русі. За пяць дзён знаходжання ў «Растове Вялікім» госці агледзяць Крэмль і іншыя выдатнасці старажытнага горада, праедуць па гарадах і весях Яраслаўшчыны, пабываюць у Угліч, Барысаглебску, Пераяслаўлі-Залескім, Яраслаўлі, Загорску, будуць вадзіць карагоды на лясных палянках і ўдзельнічаць у вясковых вячорках, слухаць ігру самадзейных аркестраў рускіх інструментаў. Яны будуць знаёміцца не толькі з помнікамі старажытнасці глыбокай, але пабываюць на буйнейшых прамысловых прадпрыемствах, у навуковых лабараторыях, калгасах, навучальных установах. Перад ад'ездам дамоў госці збяруцца ў клубе «Мая айчына», дзе адбудзецца абмен уражаннямі, вялікая размова аб рэвалюцыйных, баявых, маральных, эстэтычных, бытавых, працоўных традыцыях савецкага народа.

Вопыт, які будзе накоплены першым Міжнародным маладзёжным цэнтрам «Растоў Вялікі», мяркуецца перадаць іншым такім жа цэнтрам, якія намечана арганізаваць у нацыянальных рэспубліках, краях і абласцях.

У заключэнне нашай гутаркі Уладзімір Суворай гаворыць:

— Мы хочам, каб «Растоў Вялікі» быў не толькі турысцкім цэнтрам, але і месцам правядзення фестываляў, конкурсаў, выставак, семінараў, школ-лаў, інтэрнацыянальнага, патрыятычнага і камуністычнага выхавання моладзі.

Яўгеній БАЛОЦІН,
спецыяльны карэспандэнт АДН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

16 мая

Першая праграма. 9-10—тэлебачанне—школе. Беларуская літаратура. 8-ы клас. «Лірыка Максіма Багдановіча». 9-45—«Паўночны заход». Кінанарыс. 10-00—тэлевізійны навіны (М). 10-15—для дзяцей. «Цуды прыроды» (М). 10-30—«Канцэрт калектыву мастацкай самадзейнасці прафсаюза работнікаў сувязі». (М). 11-30 — «Прагрэс». Інтэрвізійны часопіс (М). 12-00—тэлевізійны спектакль (М). 13-00 — «Вялікагонае міру». Перадача з Польшчы (у запісе) (М). 16-40 — праграма перадач. 16-45 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00—«Гадзіна навукі». Агульнаасаюзны рэпартаж (М). 18-00—«Чалавек зямлі маёй». Таленавіты пра дырэктара сайгаса «Любанскі» Героя Сацыялістычнай Працы Э. Н. Молэнка. 18-30—«Панарама навін». 18-40—«На X завальным аглядзе кіна- і тэлефільмаў рэспублік Савецкай Прыбалтыкі, Малдавіі і Беларусі». 19-15—«Эстафета навін» (М). 20-00—праграма Ульянаўскай студыі тэлебачання. 22-00—«На музычнай хвалі». 22-10—да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Літаратурны тэатр. А. Вялюгін «Вецер з Волгі». 22-50—«На агеньчыку» (М).

Другая праграма. 18-00—для малодшых школьнікаў. «Свеціць зорачка» (М). 18-30—канцэрт народнага хору. Перадача з Луганска. 19-15—да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «У шасцнаццаць хлапечых гадоў». Дакументальны фільм. 19-45 — рэкляма, аб'явы. 20-00 — чэмпіянат СССР па лыжных атлетычных. Перадача з Растова-на-Доне. 21-30—«Вамі». Праэмера тэлевізійнага спектакля па творах У. Маякоўскага. Перадача з Ленінграда.

17 мая

Першая праграма. 8-25—праграма перадач. 8-30—для студэнтаў тэхнікумаў. «Супрамат». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45—тэлевізійныя навіны (М). 10-00—«Будзьце вічаслівыя». Музычная вясёлая праграма (М). 10-30—«Вуліца, пешаход, транспарт». 10-45—«Здароўе». Тэлевізійны часопіс. 11-35—«Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 11-55 — «Музычная шкатулка». 12-05—да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. «Юбілейныя выданні». 12-30—«На X завальным аглядзе кіна- і тэлефільмаў рэспублік Савецкай Прыбалтыкі, Малдавіі і Беларусі». 13-15—«Народны кантроль». Тэлевізійны часопіс. 14-00—творчы вечар ленінградскага тэатра юнага гледача (М). 15-00 — «Сельскі веснік». 15-30—праграма каляровага тэлебачання. 1. Для дзяцей. «Калабок». Тэлевізійны спектакль. 2. Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля народнага танца пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР І. Майсеева (М). 17-00—чэмпіянат Еўропы па гімнастычных (жаночых). Перадача са Швецыі. 20-15—«Свет сапыліма» (М). 20-25—«КВЗ-69». Фінал (М). 22-45—тэлевізійныя навіны (М). 23-00—чэмпіянат СССР па лыжных атлетычных. Перадача з Растова-на-Доне (у запісе) (М).

Другая праграма. 10-30—«Чалавек і рэлігія». Тэлевізійны часопіс. Перадача са Львова. 11-00—у эфіры—«Маладосць» (М). 12-00—«Аўтаматызацыя-69». Рэпартаж з Савецкага павільёна выстаўкі (М). 12-30 — «Аб'ектыў». Тэлевізійны клуб кіна- і фотааматараў. Перадача з Вільнюса. 13-30—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма. Перадача з Тбілісі. 14-00—«Сыны». Тэлевізійны фільм. 15-00 — «Мой завод, мая сям'я». Перадача з Ленінграда. 20.00 — «Сэрцы чатырох». Мастацкі фільм. 21-30—«Талін-67». Музычны фільм.

18 мая

Першая праграма. 8-25—праграма перадач. 8-30—для студэнтаў тэхнікумаў. «Асновы электратэхнікі». 9-00—«На заразку станавіся!» 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10.00 — «Музычны пінсэт» (М). 10-30 — «Скарбы Ленінграда». «Ліхтары над Вішай». Перадача з Ленінграда. 11-00—для юнацтва. «Шлях у навуку». Вышэйшая сярэдняя адзінай школы (М). Для воінаў Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту 12-00 — «Сустрэча з рэдакцыяй кіначасопіса «Савецкі воін» (М). 12-30 — «Звязда». Тэлевізійны часопіс. 13-30—спектакль для дзяцей. 14-35 — «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1967-ы». 15-15 — праграма каляровага тэлебачання. 1. «Спявае Жаклін Бонер». Фільм-канцэрт. 2. «Клуб кінападарожнікаў» (М). 17-00—чэмпіянат Еўропы па гімнастычных (жаночых). Перадача са Швецыі. 19-30—«Народы». Мастацкі фільм (М). 20-45—«Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 21-30—«На X завальным аглядзе кіна- і тэлефільмаў рэспублік Савецкай Прыбалтыкі, Малдавіі і Беларусі». 22-15—матч выратавальцаў. Зборная Італіі—зборная СССР (у запісе). 23-15—тэлевізійныя навіны (М). 23-30—«Спартыўны тыдзень» (М).

Другая праграма. 12-30—для школьнікаў. «Прывітанні нашых сяброў». «Як мы малюем». Перадача з Будапешта. 13-30—«Сельская гадзіна» (М). 14-30—«Волжскія напевы». Канцэрт Волжскага народнага хору. Перадача з Куйбышава (М). 19-30—«Творчы вечар Маі Плісецкай». Фільм-канцэрт. 21-05—экран каротнамеражнага фільма. «Лебядзіная песня». 21-30—праграма каляровага тэлебачання (М).

АБЫШЛОСЯ Ў КАПЕЕЧКУ

Самым цікавым было тое што з малатка ішла адзіная медная манета вартасцю ў адно пені. Нарэшце нейкі Джэфры Корн купіў гэту манету за 2.600 фунтаў стэрлінгаў, што ў 624.000 разоў вышэй за яе намінальны кошт. Прычынай такі надзвычайнай каштоўнасці медзяка — час выпуску: 1933 год. Як сцвярджаюць нумізматы, у тым годзе было адчаканена ўсяго шэсць адналенсавых манет — пяць з іх ў выставачнай зале Манетнага двара і ў Брытанскім музеі.

Нядаўна знойдзеную апошнюю шостую манету змог набыць каленцыянер, які зполеў, як паказаў аўкцыён, заплаціць за яе суму блізкую да гадавога даходу члена англійскага парламента.

А. ДРАХЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ

З 31 мая па 9 чэрвеня г. г. у Ніцы (Францыя) будзе праходзіць Міжнародны фестываль кнігі, у якім прымуць удзел выдаўцы, бібліятэкары, прадаўцы кніг і — упершыню ў гісторыі такіх мерапрыемстваў — аўтары кніг. На фестываль адгукнуліся і шырокая публіка, цікавасць якой да гэтага мерапрыемства падтрымліваецца сродкамі масавай інфармацыі — друкам, радыё і тэлебачаннем. У ганаровы камітэт фестывалю ўвойдуць вядомыя французскія пісьменнікі, члены французскай акадэміі і Акадэміі Ганкур, а таксама рад буйных пісьменнікаў розных краін.

На запланаваных нарадах будуць абмяркоўвацца наступныя тэмы: «Творчы лух і кніга», «Кніга і прагрэс асобы», «Кніга і адпачынак». У час фестывалю ў Ніцы будуць арганізаваны выстаўкі кніг і ілюстрацый.

Больш як дваццаць краін ужо выказалі жаданне ўдзельнічаць у фестывалі.

«Новости ЮНЕСКО».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04 аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 11504